ЗВЯЗДА

30 кастрычніка 1996 г. серада, № 259 (23062)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1000 рублёў

ЯК АТРЫМАЦЬ КРЭДЫТ НА БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ?

Чытаў у прэсе, што Прэзідэнт краіны падпісаў Указ аб выдачы маладым сем'ям 2-працэнтнага крэдыту для будаўніцтва ці куплі жылля. Куды трэба звярнуцца, каб яго атрымаць і якія неабходна для гэтага прадставіць дакументы? Да таго ж, ці маю я права на крэдыт, калі працую з жонкай прадаўцом на стадыёне «Дынама»?

Уладзімір С., г. Мінск.

Як нам паведамілі ў крэдытным аддзеле Мінскага гарадскога ўпраўлення Ашчадбанка, размова ідзе пра 5-працэнтны крэдыт. Пад 2 працэнты Нацбанк выдзяляе крэдыт Ашчадбанку. На льготнае крэдытаванне могуць разлічваць толькі тыя грамадзяне, якія зарэгістраваны ў мясцовых выканкомах як маючыя патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў ці сем'і, якія жывуць разам з бацькамі. У залежнасці ад таго, ці то на долевы ўдзел, ці на будаўніцтва жылля ў ЖБК, крэдыт будзе выдавацца па месцы жыхарства (прапіскі) ці па месцы будаўніцтва ЖБК, калі вядома месца забудовы. Неабходна прадаставіць даведку з домакіраўніцтва аб саставе сям'і, даведку аб каштарысным кошце кватэры і ўказанне, па якому праекту яна будзе будавацца. Акрамя таго, ільготныя крэдыты прадастаўляюцца маладым сем'ям у памеры 90 працэнтаў кошту жылля з пагашэннем яго, пачынаючы з наступнага месяца. Права на яго атрымання маюць сем'і, сярэднямесячны сукупны даход якіх не перавышае гранічнага ўзроўню, устаноўленага ў памеры двух сярэднедушавых спажывецкіх бюджэтаў на кожнага члена сям'і (г. зн. не больш як 2 млн. рублёў на чалавека). Акрамя таго неабходна мець паручыцельства двух фізічных асоб, якое трэба аформіць у натарыяльнай канторы. Пры атрыманні крэдыту афармляецца дагавор-залог на кватэру, якая будуецца. Працуеце вы ў прыватнай ці дзяржаўнай структуры, ніякага значэння не мае.

Сяргей КУРКАЧ.

РОЗГАЛАС

ЗАЦВЕРДЖАНЫ ПАРАДАК ЗБОРУ ПЛАТЫ ЗА ПРАЕЗД ПА АЎТАДАРОЗЕ БРЭСТ—МІНСК—МЯЖА РАСІІ

Зацверджаны стаўкі і парадак збору платы з уладальнікаў транспартных сродкаў за праезд па аўтамабільнай дарозе Брэст—Мінск—мяжа Расійскай Федэрацыі.

Па звестках БелаПАН, плата будзе збірацца пры ўездзе і выездзе на аўтамабільную дарогу праз спецыяльныя пасты рэспубліканскага дзяржпрадпрыемства «Белаўтастрада». Для разавай паездкі ўстаноўлены наступныя стаўкі: для легкавога аўтамабіля — 2 долары, для легкавога аўтамабіля з прычэпам — 3 долары, для аўтобуса, грузавога аўтамабіля (цягача) — 5—10 долараў (у залежнасці ад колькасці восей).

Тым, хто мае намер карыстацца гэтай аўтастрадай даволі часта, прапануецца набыць абанементную картку тэрмінам на адзін тыдзень, адзін месяц, тры месяцы альбо на год. Кошт карткі для легкавога аўтамабіля, напрыклад, вагаецца ад 8 долараў (на адзін тыдзень) да 384 (на год). Плата за карыстанне аўтамабільнай дарогай уводзіцца для ўсіх карыстальнікаў. Часова, тэрмінам на два гады, ад яе вызваляюцца толькі ўладальнікі транспартных сродкаў, зарэгістраваных у Беларусі.

Акрамя таго, ад платы за праезд вызваляюцца замежныя перавозчыкі, якія ажыццяўляюць перавозку гуманітарных грузаў. Плата за праезд транспартных сродкаў замежных дзяржаў павінна рабіцца ў валюце, а з уладальнікаў транспартных сродкаў дзяржаў — удзельніц СНД — у валюце ці ў беларускіх рублях па курсу Нацыянальнага банка рэспублікі.

Тэрміны ўвядзення ў дзеянне аплаты за праезд па названай аўтастрадзе яшчэ не зацверджаны.

Святлана ЮЗІК, БелаПАН.

ЧАРВЯЧОК ПАД ШКЛЯНКУ КАВЫ

Жыццё цяпер, вядома, не цукар. Цэны растуць, грошай не хапае, многія перабіваюцца з малака на хлеб. І ўсё ж калі вельмі захацець, дык хаця б зрэдку, але можна дазволіць сабе маленькае свята ў выглядзе нейкіх прысмакаў да шклянкі кавы. Што ж прапануюць пакупнікам кандытары, напрыклад, Навагрудскага хлебазавода?

Як высветліла Служба кантролю Прэзідэнта па Гродзенскай вобласці, з ліпеня па кастрычнік на прадпрыемстве ў ход ішоў арахіс, паражоны шкоднікамі (чарвякамі). Акрамя таго, больш як два гады выкарыстоўвалася какава-парашок са скончаным тэрмінам захоўвання (закупленая ў 1992—1993 гадах). Толькі ў жніўні—кастрычніку з няякаснай сыравіны хлебазаводам выраблена прадукцыі на суму 157,8 мільёна рублёў. У ходзе праверкі забаронена далейшая рэалізацыя 514 кілаграмаў какавы і 48 — арэху.

І гэта яшчэ не ўсё. На заводзе пастаянна парушалі тэрміны захоўвання хлебабулачных вырабаў. У накладных на водпуск прадукцыі ў гандлёвую сетку час выхаду яе з печы прастаўляўся адвольна, што вяло да рэалізацыі чэрствых вырабаў пад выглядам свежых. Да таго ж, на ўпакоўках не ставіўся канчатковы тэрмін продажу прысмакаў. Падлічана, што ў маі—кастрычніку пакупнікі вылажылі 6,1 мільёна рублёў за 251 кілаграм прадукцыі са скончаным тэрмінам захоўвання.

Служба кантролю Прэзідэнта па Гродзенскай вобласці прымяніла да навагрудскага хлебазавода эканамічную санкцыю ў выглядзе штрафу на суму 163,9 мільёна рублёў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

РЭПАРЦЁР АТРЫМАЎ ЗАДАННЕ...

...ЗАМЯНІЦЬ СВОЙ ПАШПАРТ

Чалавек без пашпарта ў нашай краіне не чалавек. У гэтым лёгка пераконваешся, калі спрабуеш пасяліцца ў гасцініцы, запісацца ў бібліятэку або набыць білет на поезд у суседнюю дзяржаву. «Я волком бы выгрыз бюрократизм, любую бумажку, но эту...» — пісаў калісьці Уладзімір Маякоўскі. Ведаў бы вялікі паэт, з якой цяжкасцю даецца нам сёння гэта «паперка», ён бы так не гаварыў. Вось і аўтару гэтых радкоў, у сувязі з неабходнасцю замены пашпарта, давялося сутыкнуцца з «сістэмай», мінаваць якую ў гэтым выпадку няма ніякай магчымасці...

(Заканчэнне на 3-й стар.)

У БЕЛАРУСІ ЧАКАЕЦЦА АЎТАМАБІЛЬНЫ БУМ

Практычна кожная другая гарадская сям'я ў Беларусі, паводле прагнозаў спецыялістаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, будзе мець к 2000 году ўласны легкавы аўтамабіль. Гэта сцвярджэнне, улічваючы агульнае крызіснае становішча эканомікі і рэзкае зніжэнне жыццёвага ўзроўню большай часткі насельніцтва нашай рэспублікі, можна ўспрымаць з доляй скептыцызму, аднак лічбы і факты пацвярджаюць заключэнні міжнародных экспертаў. Так, за апошнія 5 гадоў колькасць прыватных легкавых аўтамабіляў узрасла ў 1,5 раза. У вялікіх і буйных гарадах на 1000 жыхароў прыпадае 90—110 асабістых транспартных сродкаў, і пры захаванні цяперашніх тэндэнцый да пачатку наступнага стагоддзя ўзровень матарызацыі насельніцтва дасягне 140—160 аўтамабіляў на 1000 гараджан.

Вадзім МІЛІЦЫН, БЕЛТА.

У «БЕЛАРУСІ» ЗАТРЫМАЛІ ПАДРЫЎНІКА

Страсць да «гульні» з выбуховымі ўстройствамі (узгадаем хаця б захоп тэрарыстам дзіцячага садзіка, аднаго з філіялаў камерцыйнага банка, калі на «справу» бандыты ішлі нашпігаваныя ўзрыўчаткай або гранатамі), падобна, набывае ў рэспубліцы папулярнасць.

Пазбаўленне ад канкурэнтаў па бізнесу, ліквідацыя «аўтарытэтаў» крымінальнага свету таксама часам суправаджаецца выбухамі. Несумненна, усё гэта не застаецца па-за ўвагай тых, хто мае дачыненне да гандлю зброяй. З'яўляецца ўсё больш прадаўцоў, якія зарабляюць капітал менавіта на нелегальным бізнесе выбуховымі рэчывамі і прыстасаваннямі.

Адзін з такіх «бізнесменаў» у чацвер быў затрыманы супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС Беларусі ў гасцініцы «Беларусь». Як нам стала вядома, аперацыя была дэталёва распрацавана і ніякай небяспекі ў ходзе яе правядзення для пражываючых у гасцініцы не было. Што датычыцца «рыбіны», якая трапіла ў сеткі міліцыі, то ёй аказаўся жыхар сталіцы: пры спробе збыту выбуховых прыстасаванняў яго і ўзялі. Быў гэта пасрэднік або затрыманы «гаспадар» — устанавіць следства.

Ігар ГРЫШЫН.

УДАКЛАДНЕННЕ

У пятым абзацы пункта 5 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 кастрычніка 1996 г. № 442 «Аб мерапрыемствах па забеспячэнню падрыхтоўкі і правядзення рэспубліканскага рэферэндуму 24 лістапада 1996 г.» словы «восьмы» і лік «28» трэба чытаць адпаведна «шосты» і «31».

Галоўнае ўпраўленне прававога забеспячэння Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



У гаспадарцы — перапынак... Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Я ШЧЫРА ГАНАРУСЯ ПАДТРЫМКАЙ ПА-САПРАЎДНАМУ МУДРЫХ ЛЮДЗЕЙ»

З выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Лукашэнкі А. Р. на Канферэнцыі рэспубліканскай арганізацыі ветэранаў 29 кастрычніка

Мае апаненты часта з пагардай кажуць, сказаў Аляксандр Лукашэнка, што Прэзідэнта падтрымліваюць пераважна людзі старэйшага ўзросту. Я ж, адкрыта скажу, шчыра ганаруся падтрымкай па-сапраўднаму мудрых людзей, якія валодаюць вялікім жыццёвым вопытам! Затое мяне абурае пазіцыя некаторых ідэолагаў правага, ды ўжо і левага толку, якія спяшаюцца спісаць ветэранаў з рахунку як штосьці аджыўшае, лішняе. Наадварот, менавіта ветэраны ў гэтым складаным становішчы яшчэ і яшчэ раз паказваюць сябе з самага лепшага боку.

Хіба мала ў нас кіраўнікоў-ветэранаў, якія і ў рынкавых умовах змаглі так наладзіць работу сваіх прадпрыемстваў, што і людзі задаволены, і дзяржава не нясе страты? Возьмем хоць бы нашых славутых старшынь сельгаспрадпрыемстваў Бядулю, Старавойтава. Ужо, здавалася б, яны, стаўпы калгаснага ладу, пры рынку першымі павінны былі «легчы». А яны працуюць, і нядрэнна працуюць! Без крыкаў, без шуму, без празмернага радыкалізму ўпісаліся ў рынак.

Многія ж з тых, хто патрабаваў неадкладных і рашучых рынкавых рэформаў, як сядзелі на дзяржаўных датацыях пры камуністах, так і ў рынку з адным разбітым карытам засталіся.

Тысячы ветэранаў, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, і на іншых участках работы працягваюць добрасумленна працаваць, перадаючы свой багаты вопыт маладым, уносіць пасільны ўклад у агульную справу.

Чаму ж некаторыя палітыкі так апалчыліся супраць ветэранаў і лічаць вас ледзь не тормазам руху наперад? А справа ў тым, што ветэранаў нялёгка падмануць. Вы прывыклі за слоўным шалупіннем бачыць сутнасць праблемы і дрэнна паддаяцеся ўплыву хлуслівай палітычнай прапаганды. Мора хлусні, вылітае на вас апазіцыйнымі палітыкамі і сродкамі масавай інфармацыі, выклікана ў многім тым, што ветэраны аказаліся больш стойкімі да псеўдарынкавай і псеўдадэмакратычнай балбатні, чым моладзь і некаторыя іншыя сацыяльныя групы нашага грамадства, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Будзем шчырымі, сказаў ён далей, вам сёння жывецца нялёгка, напэўна, цяжэй, чым многім іншым. Мы ўдзячныя вам за ваша цярпенне і веру ў будучыню. Не хачу падманваць вас і абяцаць вам хуткай манны нябеснай. Не ўсё залежыць ад кіраўніцтва краіны. Корань многіх нашых праблем, на жаль, ляжыць не ў Беларусі.

У складанай абстаноўцы, што склалася пасля развалу Савецкага Саюза, мы павінны перш за ўсё спадзявацца на сябе і мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы развіцця.

Цяпер, адзначыў Прэзідэнт, нам удалося спыніць спад вытворчасці. За 9 месяцаў нават крыху прыбавілі. Валавы ўнутраны прадукт трошкі вырас у параўнанні з узроўнем мінулага года. Лепш сталі працаваць многія прамысловыя прадпрыемствы. Ёсць, аднак, прадпрыемствы, якія працуюць не на поўную сілу.

За кошт разумнай дзяржаўнай палітыкі мы захавалі сваю сельскую гаспадарку. Сёлета атрымалі нядрэнны ўраджай. Карыстаючыся выпадкам, я хацеў бы падзякаваць сельскім ветэранам, якія ўнеслі вялікі ўклад у дасягненні гэтага года.

Нягледзячы на ўзрост і розныя хваробы, ветэраны і гаспадаркам дапамагаюць, і на прысядзібных участках атрымліваюць значную частку бульбы, мяса, малака, агародніны і іншых прадуктаў. Думаю, не ганіць трэба гэтых людзей, а ў ногі ім пакланіцца за шматгадовы працоўны подзвіг!

Цаной велізарных намаганняў удалося пераламаць сітуацыю ў жыллёвым будаўніцтве. За тры кварталы гэтага года ўведзена амаль у два разы больш жылля, чым за аналагічны перыяд мінулага года. У простых людзей адраджаецца абгрунтаваная надзея на тое, што з дзяржаўнай дапамогай яны змогуць пастунова вырашыць жыллёвую праблему. Асаблівa вялікую ўвагу будзем удзяляць жыллёваму будаўніцтву для моладзі.

Нам удаецца стрымліваць беспрацоўе. Мы не дапусцілі масавых звальненняў, калі работнікі прадпрыемстваў выкідваюцца на вуліцу. У нас ёсць і свабодныя рабочыя месцы. Ёсць конкурс рабочай сілы, ёсць магчымасць выбраць работу.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

З ПОШТЫ ПРЭЗІДЭНТА

«ПАДТРЫМЛІВАЕМ ВАС І ВАШЫ ПАЧЫНАННІ...»

Рашэнні, прынятыя першым Усебеларускім народным сходам, шырока абмяркоўваюцца як у працоўных калектывах, колах грамадскасці, сярод палітыкаў, так і радавымі грамадзянамі. Многім блізкія па духу тыя высновы і ацэнкі, што прагучалі на беларускім вечы. Аб гэтым сведчаць шматлікія пісьмы і тэлеграмы, адрасаваныя Прэзідэнту краіны Аляксандру Лукашэнку.

Як паведаміў у тэлеграме вядомы беларускі пісьменнік Іван Шамякін, па стану здароўя ён не змог прыняць удзел у сходзе, аб чым вельмі шкадаваў, сочачы за прамой трансляцыяй па тэлебачанні. «Падтрымліваю ўсе палажэнні вашага змястоўнага даклада, Аляксандр Рыгоравіч, рэзалюцыю сходу. Жадаю поспехаў вам у правядзенні рэферэндуму, у дзяржаўнай дзейнасці, здароўя. Вас глыбока паважае ўся мая сям'я», — напісаў Іван Шамякін.

«Захапляюся вашымі глыбока змястоўнымі ва ўсіх сэнсах прамовамі на першым Усебеларускім народным сходзе. Падтрымліваю вас і вашы пачынанні. Паважаю, захапляюся і ганаруся Прэзідэнтам», — паведаміў у тэлеграме на імя Аляксандра Лукашэнкі мінчанін маёр запасу Віктар Каталасаў.

«Усе вашы справы, Аляксандр Рыгоравіч, блізкія мне і ўсяму нашаму народу. Мы заўсёды з вамі і падтрымліваем вашу палітыку», — пратэлеграфавала Прэзідэнту віцьблянка Марыя Плавінская.

«Будзьце разам з Прэзідэнтам і стварайце моцную прэзідэнцкую рэспубліку!» — з такім наказам звярнуўся да дэлегатаў праведзенага форуму беларус з Сімферопаля Сяргей Канoвіч. Ён падкрэслівае, што ўпершыню за шматвяковую гісторыю кіраўнік дзяржавы даў беларускаму народу права самому вырашаць свой лёс і лёс Бацькаўшчыны, і людзі павінны зрабіць дастойны выбар.

«Настаў час стаць побач з Аляксандрам Рыгоравічам, якога мы выбралі Прэзідэнтам!» — з такім заклікам звярнуліся да сем'яў загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў і інвалідаў актывісты Гомельскай гарадской арганізацыі салдацкіх, «афганскіх» сем'яў і інвалідаў.

«Прэзідэнт імкнецца навесці парадак у краіне, умацаваць дысцыпліну, прымусіць працаваць законы», — лічаць дэпутаты Снядзінскага сельскага Савета дэпутатаў Петрыкаўскага раёна. Што датычыць пытанняў, прапанаваных Прэзідэнтам на рэферэндум, яны поўнасцю салідарныя з яго думкай, выказанай на сходзе: неабходна выключыць куплю-продаж зямлі. Яна павінна быць замацавана за тымі, хто на ёй працуе. І яшчэ: закон павінен караць у поўнай меры тых, хто ўчыняе цяжкія злачынствы. Таму смяротную кару адмяняць заўчасна, лічаць сельскія дэпутаты.

БЕЛТА.

МНОГІЯ СВАЕ ПРАБЛЕМЫ ГРАМАДЗЯНЕ РЭСПУБЛІКІ ПА-РАНЕЙШАМУ СПАДЗЯЮЦЦА ВЫРАШЫЦЬ З ДАПАМОГАЙ ПРЭЗІДЭНТА

Большасць сваіх праблем многія жыхары рэспублікі па-ранейшаму спадзяюцца вырашыць пры садзейнічанні Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі. Як стала вядома карэспандэнту БЕЛТА, толькі ў студзені—кастрычніку гэтага года да кіраўніка дзяржавы і ў Адміністрацыю Прэзідэнта звярнуліся амаль 22 тысячы чалавек. 3920 з іх былі прыняты ў рэзідэнцыі Прэзідэнта рэспублікі.

Згодна з даведкай, падрыхтаванай для Аляксандра Лукашэнкі кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Міхаілам Мясніковічам, аналіз прапаноў, заяў і скаргаў паказвае, што насельніцтва чуйна рэагуе на палітычныя, ідэалагічныя, сацыяльна-эканамічныя працэсы, якія адбываюцца ў рэспубліцы, а таксама на недахопы і хібы ў рабоце органаў улады і кіравання. Станоўча ўспрымаюцца меры па сацыяльнай падтрымцы людзей.

Шмат пісьмаў і тэлеграм прыходзіць у падтрымку ўзятага Прэзідэнтам курсу на ўмацаванне беларуска-расійскіх адносінаў і яго ініцыятывы па правядзенню рэферэндуму. Што датычыць апошняга, то толькі за мінулы месяц паступіла каля тысячы зваротаў.

Штодзённа, адзначаецца ў даведцы, у камісію па дапрацоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прыходзяць дзесяткі прапаноў і заўваг. Пісьмы грамадзян прадыктаваны трывогай за падзеі, якія адбываюцца ў рэспубліцы, занепакоенасцю процістаяннем асобных палітыкаў Прэзідэнту. Іх аўтары асуджаюць дзеянні Вярхоўнага Савета, Канстытуцыйнага суда, лідэраў Беларускага народнага фронту, іншых грамадскіх аб'яднанняў, накіраваныя на канфрантацыю з кіраўніком дзяржавы, на зрыў рэферэндуму, прапануюць свае паслугі ў арганізацыі правядзення рэферэндуму на грамадскіх асновах.

Аналагічную ацэнку палітычным падзеям далі грамадзяне рэспублікі ў дні правядзення Усебеларускага народнага сходу. У яго адрас паступіла звыш тысячы тэлефонных званкоў па «гарачай лініі», тэлеграм, пытанняў і прапаноў. У большасці сваёй іх аўтары выказалі згоду з неабходнасцю правядзення рэферэндуму, умацавання прэзідэнцкай улады, выказаліся супраць куплі-продажу зямлі і адмены смяротнай кары. Шмат крытычных заўваг паступіла ў адрас Вярхоўнага Савета, арганізатараў альтэрнатыўнага сходу і антыпрэзідэнцкага мітынгу.

Разам з тым большасць зваротаў грамадзян да Прэзідэнта рэспублікі і Усебеларускага народнага сходу датычыць пытанняў, якія павінны вырашаць міністэрствы, іншыя цэнтральныя органы кіравання, мясцовыя распарадчыя органы, грамадскія аб'яднанні, прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы. Многія з адрасаваных ім пытанняў і скаргаў разглядаюцца несвоечасова, фармальна, а выкананне прынятых па іх рашэнняў часта не кантралюецца. Не заўсёды вывучаюцца прычыны і ўмовы, што выклікаюць абгрунтаваныя скаргі, не прымаюцца дастатковыя меры для іх ліквідацыі.

Па-ранейшаму адной з асноўных тэм, якія закранаюць у пісьмах грамадзяне (23 працэнты), застаецца жыллёвая праблема. Гэта датычыць не толькі паляпшэння жыллёвых умоў, але і льготных крэдытаў і субсідый на будаўніцтва жылля, недахопаў у эксплуатацыі дзяржаўнага і ведамаснага жылля, несвоечасовага і няякаснага рамонту, нездавальняючага цепла- і водазабеспячэння жылых дамоў.

Звыш чатырох з паловай тысяч чалавек звярнуліся па пытаннях працы, пенсіённага забеспячэння, сацыяльнай абароны. Часцей за ўсё грамадзяне просяць аказаць садзейнічанне ў працаўладкаванні, скардзяцца на звальненне ў сувязі са скарачэннем штатаў, цяжкае матэрыяльнае становішча. У той жа час, гаворыцца ў даведцы, у выніку прынятых Аляксандрам Лукашэнкам і Кабінетам Міністраў мераў па сацыяльнай падтрымцы насельніцтва апошнім часам значна зменшылася колькасць зваротаў па гэтых пытаннях. Практычна няма скаргаў на несвоечасовую выплату пенсій, дапамог, заработнай платы.

Нямала зваротаў (16 працэнтаў) абумоўлена парушэннямі законнасці і правапарадку, злоўжываннямі з боку службовых асоб. Жыхары рэспублікі скардзяцца на нездавальняючую дзейнасць праваахоўных органаў па раскрыццю злачынстваў, выкрыццю і пакаранню вінаватых, валакіту пры расследаванні і разглядзе крымінальных і грамадзянскіх спраў, невыкананне судовых рашэнняў.

Звароты, якія паступілі ў Адміністрацыю Прэзідэнта, уважліва і своечасова разглядаліся, падкрэсліваецца ў даведцы. Грамадзянам аказвалася неабходная дапамога ў вырашэнні іх надзённых праблем. Усе канкрэтныя пытанні і просьбы, пададзеныя ў ходзе Усебеларускага народнага сходу, таксама будуць уважліва разгледжаны.

Віктар КУКЛОЎ, БЕЛТА.

ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР І ПРАФСАЮЗНЫ ЛІДЭР ЗРАЗУМЕЛІ АДЗІН АДНАГО

Перамены, што адбываюцца ў Беларусі, суправаджаюцца эканамічным крызісам, сацыяльнай напружанасцю і зніжэннем жыццёвага ўзроўню большасці насельніцтва краіны. Гэта канстатавалі на праведзенай 28 кастрычніка сустрэчы прэм'ер-міністр Міхаіл Чыгір і старшыня Федэрацыі прафсаюзаў беларускай Уладзімір Ганчарык.

Як паведаміў карэспандэнту БЕЛТА У. Ганчарык, на сустрэчы абмяркоўваўся шырокі круг эканамічных праблем. У прыватнасці, размова ішла пра падпісаную кіраўніком урада пастанову аб умовах выхаду на пенсію людзей, якія працуюць на асабліва цяжкай вытворчасці. Прафсаюзы даўно дабіваліся прыняцця гэтага дакумента. Таму што пасля распаду СССР і ўтварэння незалежнай Беларусі перастала дзейнічаць саюзнае заканадаўства, і работнікі, занятыя асабліва цяжкай працай, аўтаматычна страцілі ранейшы стаж і льготы. Цяпер іх статус-кво адноўлены.

У ходзе сустрэчы таксама дасягнуты дамоўленасці па выплатах запазычанасцей работнікам сацыяльнай сферы. Не забыліся і пра дзяцей. Прэм'ер-міністр абяцаў адшукаць сродкі, каб надыходзячыя навагоднія святы для беларускай дзятвы не былі азмрочаны з-за адсутнасці ў працоўных калектываў грошай на святочныя ранішнікі і падарункі ад Дзеда Мароза.

Валянціна МЕНШЫКАВА, БЕЛТА.

МЕТРАБУДАЎНІКІ ШУКАЮЦЬ ВЫЙСЦЕ... З ТУПІКОВАЙ СІТУАЦЫІ

Улады беларускай сталіцы і яе жыхары вялікія надзеі звязваюць з адкрыццём новых станцый метро — «Партызанскай» і «Аўтазаводскай». Таму што, паводле статыстычных даных, калі ўвесь грамадскі транспарт сталіцы сёння перавозіць 3,5 мільёна пасажыраў у суткі, то метро — 500 тысяч з іх. Гэта значыць падземныя лініі як самы хуткі, надзейны, зручны і экалагічна чысты від транспарту ўжо нясуць даволі вялікую нагрузку.

Паводле папярэдніх разлікаў, увод вышэйназваных станцый у эксплутацыю намечаны на чацвёрты квартал 1997 года. Да назначанага тэрміну застаўся толькі адзін год. Як стала вядома карэспандэнту БЕЛТА з дакладных крыніц, метрабудаўнікі недаатрымалі на правядзенне неабходнага аб'ёму работ каля 45 мільярдаў рублёў. У сувязі з гэтым і ўзнікаюць сумненні наконт рэальнасці намечаных раней тэрмінаў пуску станцый «Партызанская» і «Аўтазаводская».

— За 9 месяцаў сёлетняга года метрабудаўнікі выканалі будаўніча-мантажных работ на 190 мільярдаў рублёў, — расказвае начальнік дзяржаўнага будаўнічага прадпрыемства «Мінскметрабуд» Аляксей Сярогін. — Што датычыць пускавога ўчастка, гэта значыць аўтазаводскага накірунку, то тут пракладзена канструкцый верхняй пабудовы пуці на 5,3 кіламетра з 7,2 кіламетра агульнай працягласці. Забетанавана 3,9 кіламетра. Вядзецца мантаж стрэлачных пераводаў за станцыяй «Аўтазаводская». Але, сапраўды, з-за недастатковага фінансавання мы практычна не праводзім сантэхнічныя і электратэхнічныя работы. А да ўводу ўчастка ў эксплуатацыю застаецца абліцаваць гранітам і мармурам 11 тысяч квадратных метраў канструкцый, укласці маналітны бетон і жалезабетон у аб'ёме 2,6 тысячы кубаметраў, зманціраваць 1,2 тысячы кубаметраў зборнага жалезабетону, правесці гідраізаляцыю канструкцый на адлегласці 2,7 тысячы квадратных метраў і 55 тысяч кубаметраў так званай зваротнай засыпкі. Гэта цалкам пад сілу метрабудаўцам, але пры ўмове стабільнага і дастатковага паступлення сродкаў.

У цэлым жа, — працягвае Аляксей Сярогін, — тэмпы будаўніцтва метро ў апошнія гады знізіліся. Вельмі марудна вядуцца работы на наступным запланаваным участку — ад станцыі «Аўтазаводскай» да станцыі «Магілёўскай», на ўчастку «Пушкінская» — «Ракаўская» — «Кунцаўшчына» — «Каменная Горка». Нават не пачаты работы на ўчастку «Усход» — «Уручча» і па прадаўжэнню першай лініі ад станцыі «Інстытут культуры» да раёна «Паўднёвы Захад». Ва ўзнікшай сітуацыі цяжка загрузіць наяўныя вытворчыя магутнасці, забяспечыць жаданыя тэмпы будаўніцтва новых участкаў.

Але я не буду вінаваціць у гэтым кіраўніцтва сталіцы, ведаю, што яно робіць усё магчымае, а іншы раз і немагчымае для забеспячэння фінансавання будаўніцтва метро. Лепш раскажу, як мы самі шукаем выйсце з фінансавага тупіка. Напрыклад, дамовіліся з кіраўніцтвам Маскоўскага метрапалітэна аб выкарыстанні на яго аб'ектах нашых спецыялістаў. Пры гэтым не толькі людзі атрымліваюць работу і магчымасць пракарміць сям'ю, але і прадпрыемства наша мае пэўны даход. Зэканоміць сродкі, забяспечыць работай цэлыя вытворчасці дапамагае і арганізацыя выпуску патрэбнай нам спецыялізаванай тэхнікі на прадпрыемствах Беларусі.

Таццяна СМІРНОВА, БЕЛТА.

КУРСЫ АБМЕНУ НАЯЎНЫХ ВАЛЮТ у камерцыйных банках на 29 кастрычніка 1996 г.

Назва банка	Долар ЗША		Нямецкая марка		Расійскі рубель		Тэлефоны
	Купля	Продаж	Купля	Продаж	Купля	Продаж	
Гал. упр. НБ па Мінску і Мінскай вобл.	20150		13250		3.65		266-441
Ф-л «Мілавіца» АКБ «Мінскі транзітны банк»	20000	20150	13000	13250	3.55	3.65	372-825
Нацыянальны банк РБ (курс для безнаяўных разлікаў)	14950		9832.94		2.74		
Цэнтрабанк Расіі	5447		3575.32		100 бел. р. - 25.50		

Інфармацыя прадастаўлена агенцтвам Граўцова.

НАДЗЁННАЕ

ЧЭКАВАЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ: БЕЛАРУСКІ ВАРЫЯНТ

Аб'явіўшы асноўным прынцыпам прыватызацыі ў рэспубліцы права кожнага яе грамадзяніна на частку бязвыплатна перадаваемай дзяржаўнай уласнасці, дзяржава ўзваліла на свае плечы яшчэ і задачу справядлівага падзелу гэтай маёмасці паміж мільёнамі людзей самых розных сацыяльных груп і слаёў. Паабяцаць залатыя горы ўсім і кожнаму паасобку аказалася самым лёгкім у справе прыватызацыі. Давесці ж яе да лагічнага завяршэння апошнім часам робіцца ўсё цяжэй. Відаць, ужо скончыўся аптымізм у адносінах да масавай прыватызацыі практычна ва ўсіх заснавальнікаў інвестфондаў. Радавы абывацель у лёгкай разгубленасці — што ж яму дадуць у абмен на чэкі? Ды і ці дадуць увогуле? На многія пытанні, якія цікавяць нас, карэспандэнту «Звязды» адказвае начальнік упраўлення чэкавай прыватызацыі Міндзяржмаёмасці Зінаіда Сямёнаўна ШАЎЧЭНКА.

— Зінаіда Сямёнаўна, чэрвеньскай пастановай Вярхоўнага Савета рэспублікі былі прадоўжаны тэрміны налічэння і выдачы чэкаў і іх сертыфікатаў да 31 снежня гэтага года і першага ліпеня наступнага адпаведна. Ці спадзяецеся вы, што за гэты час у чэкавую прыватызацыю паверыць усё насельніцтва краіны?

— На жаль, не. Вопыт апошніх месяцаў паказаў, што тыя, хто хацеў удзельнічаць у прыватызацыі, чэкі ўжо даўно атрымалі. Бо за апошні месяц у камісіі было пададзена не больш як 3 тыс. заяў па іх налічэнню. На сённяшні дзень 5,7 мільёна чалавекам налічана звыш 484 млн. чэкаў. Восемдзесят працэнтаў вышэйназваных грамадзян (а гэта 4 млн. 590 тыс.) атрымалі на рукі сертыфікаты на агульную суму 405 млн. чэкаў. Менавіта гэтая колькасць чэкаў цяпер лічыцца ў абарачэнні.

— Як у асноўным распараджаюцца чэкамі іх уладальнікі?

— Пераважная большасць людзей захоўвае сертыфікаты да лепшых часоў. Выкарысталі свае чэкі поўнасцю ці часткова 1 млн. 217 тыс. грамадзян. Імі было спісана са сваіх рахункаў 118 млн. 740 тыс. чэкаў. Ільвіная доля з іх у аб'ёме 37 працэнтаў (43 млн. 576 тыс.) была прададзена, а 15 працэнтаў пераафармлена іншым людзям, хутчэй за ўсё, сваякам ці членам іх сем'яў. 31 працэнт чэкаў абменены — на акцыі прыватызаваных прадпрыемстваў і 17 працэнтаў на акцыі спецінвестфондаў. Па свайму прамому функцыянальнаму прызначэнню была рэалізавана менш як палова выкарыстаных чэкаў. Большую частку (52 працэнты) чэкаў людзі прадалі і пераафармілі. Гэтыя чэкі знайшлі толькі сваіх прамежкавых уладальнікаў.

— Чаму, на вашу думку, людзі вельмі асцярожна абменьваюць свае чэкі на акцыі?

— Пачынаючы з ліпеня 1994 года праз установы АСБ «Беларусбанк» да абмену на чэкі прапаноўваліся акцыі больш як 270 акцыянерных таварыстваў. Да таго ж у раённыя філіялы Ашчадбанка пастаянна ўносяцца дадатковыя пакеты акцый у абмен на чэкі. Але ў сувязі з тым, што вялікая прыватызацыя ў нас усё-такі не ідзе, новых паступленняў акцый у абмен на чэкі апошнім часам (і ў перспектыве на гэты год) не прадбачыцца. У асноўным распрадаюцца рэшткі мінулых гадоў. У свой час працоўнымі калектывамі былі заяўлены на набыццё буйныя пакеты акцый. Але яны не змаглі іх выкупіць, і пасля заканчэння тэрмінаў іх продажу акцыі былі «выкінуты» ў свабодны продаж. Усяго падрыхтавана да продажу маёмасці ў выглядзе акцый, долей і паёў на 123,8 млн. чэкаў, дзе на 86 млн. чэкаў па рэспубліканскай уласнасці і 37 млн. — па камунальнай. З іх у Ашчадбанк накіравана на продаж 58 млн. чэкаў, але цікавасць грамадзян да іх даволі стрыманая і попыт на акцыі невялікі. З агульнага аб'ёму акцый, якія выстаўляюцца на продаж, іх скупляецца толькі 40 працэнтаў, а 60 вяртаецца назад незапатрабаванымі.

— Можна меркаваць, што гэта, напэўна, акцыі вельмі слабых прадпрыемстваў...

— Так, у асноўным гэта неперспектыўныя прадпрыемствы. Бадай, у гэтым спісе ёсць і такія, якія не будуць выкуплены ніколі. Але ў большасці гэта структуры, якія даволі ўстойліва стаяць на нагах. Квітнеючых прадпрыемстваў, якія сёння мянялі б акцыі на чэкі, у рэспубліцы проста няма. Да непрывабных адносяцца прадпрыемствы будаўнічай індустрыі, за выключэннем арганізацый, якія самі выпускаюць будаўнічыя матэрыялы. Аднак і тут не ўсё гладка — акцыі заводаў жалезабетонных вырабаў таксама не карыстаюцца попытам. Няма попыту таксама на акцыі буйных машынабудаўнічых прадпрыемстваў. Хоць часам зусім дарэмна. Напрыклад, Барысаўскі завод аўтатрактарнага электраабсталявання. Пасля першага продажу ў яго было рэалізавана толькі 20 працэнтаў акцый. Рэшткі акцый былі накіраваны па месцы размяшчэння завода, у Барысаў. Там гэтыя акцыі сёння паспяхова раскупляюцца, таму што мясцовае насельніцтва больш інфармавана аб сваім заводзе. Сапраўдны ажыятаж выклікаюць у насельніцтва акцыі харчовых прадпрыемстваў, якія, як правіла, з'яўляюцца камунальнай уласнасцю гарадоў. Гэтымі акцыямі распараджаюцца выканкомы мясцовых Саветаў, і яны відавочна не спяшаюцца выстаўляць іх на продаж. Па розных прычынах гэтыя пакеты акцый рэзервуюцца, пакідаюцца на выкуп працоўным калектывам. А ў выніку такіх акцый у свабодным продажы не знайсці. Даволі хутка знаходзяць пакупнікоў паі структур, якія маюць выгаднае месцазнаходжанне ў сталіцы рэспублікі і ў абласных цэнтрах. Нярэдка фактар прэстыжнасці перацягвае ўсе астатнія, і акцыі даволі слабага прадпрыемства ў цэнтры горада імгненна ідуць «з малатка».

(Заканчэнне на 3-й стар.)

РОЗГАЛАС

«САЦЫЯЛЬНАЯ АПТЭКА»: ТАННЫЯ ЛЕКІ ДЛЯ МАЛАМАЁМНЫХ

Да такіх невядомых раней нашаму народу паняццяў, як «беспрацоўе», «сацыяльна неабароненыя слаі насельніцтва», «служба занятасці» і іншыя, цяпер дабавілася яшчэ адно — «сацыяльная аптэка».

З'яўленне на Беларусі сеткі сацыяльных аптэк [illegible] СП «Белфарм» [illegible]

[illegible] Заставіцца дадаць, што, пачынаючы з лістапада, на тэрыторыі рэспублікі будуць дзейнічаць 4 сацыяльныя аптэкі — у Мінску (вул. П. Глебкі, 118), Гродне (вул. Шчорса, 58), Віцебску (вул. К. Маркса, 108) і Гомелі (вул. Сухога, 6). А на наступны год, як плануе кіраўніцтва СП «Белфарм», іх колькасць [illegible]...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЦІ З'ЯВІЦЦА НА БЕЛАРУСІ БЕЛАРУСКАМОЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ?

Сумесную акцыю па зборы подпісаў грамадзян у абарону канстытуцыйнага права на атрыманне вышэйшай адукацыі на беларускай мове правялі Таварыства беларускай мовы і Таварыства беларускай школы.

[illegible] — стварыць [illegible] дысцыплінах [illegible] універсітэт [illegible]

[illegible] «Звяздзе» віцэ-прэзідэнт ТБШ, [illegible] навукова-[illegible] Алесь Лозка. [illegible] недзе да [illegible] сабраныя [illegible] Міністэрства адукацыі [illegible] Адміністрацыю Прэзідэнта.

[illegible] дата правядзення [illegible] агульна[illegible] адбудзецца [illegible] лёсе [illegible] кіраўнікі [illegible] адукацыі, а так[illegible]

Сяргей ГРЫБ.

РАЗ'ЯХАЛІСЯ З НІЧЫМ

Так можна ахарактарызаваць вынікі сумеснага пасяджэння Міждзяржаўнага валютнага камітэта СНД і Савета Міждзяржаўнага банка, якое адбылося ў Маскве 16 кастрычніка.

[illegible] канцэпцыі супрацоўніцтва [illegible], згодна з [illegible] для кантролю [illegible] замежных дзяржаў [illegible] дапрацоўкі [illegible] валютнага [illegible]

Дзмітрый КУМ.

СЛУЖБА РАТНАЯ — КАНТРАКТНАЯ

У цяперашні час у радах Узброеных Сіл Беларусі праходзяць ваенную службу па кантракту больш за адзінаццаць тысяч салдат і сяржантаў.

[illegible] ПВА, ВПС, [illegible] ёсць некалькі [illegible] укамплектаваны ва[illegible]

[illegible] 3300 чалавек.

[illegible] Беларусі [illegible] Узброеныя Сілы [illegible] гэтых ад[illegible] салдат і [illegible] прафесіяналізм.

Аляксандр МАКАРАЎ.

МАЦІ, ЯКІЯ ДАГЛЯДАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ, ПРЭМІЮ НЕ АТРЫМАЮЦЬ

У рэдакцыю патэлефанавала маладая мінчанка Я., якая папрасіла ўдакладніць, ці мае яна права на атрыманне прэзідэнцкай прэміі, якую нядаўна выплачвалі работнікам бюджэтнай сферы. Жанчына працуе ў адной з [illegible], але зараз знаходзіцца ў водпуску [illegible]. Пытанне цікавіць і яе сяброўку, [illegible], якая [illegible]. Па месцы працы ў атрыманні прэміі ў памеры 500 тысяч рублёў ім было адмоўлена. Наколькі гэта правамерна, цікавіцца маладая маці.

[illegible] сямейных і [illegible] абароны [illegible] Указа Прэзідэнта [illegible] сферы» [illegible] № 06-4/1111 [illegible] атрыманне [illegible]

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХТО НЕ РЫЗЫКУЕ, ТОЙ... НЕ ТОНЕ?

Не палічыце за блюзнерства, але тапельцаў [illegible] для адыходу [illegible] закрыцця купальнага сезона.

[illegible] з пачатку года [illegible] загінулі [illegible] менш, [illegible] п'янства, [illegible] купання і [illegible] інфармацыя [illegible] тапель[illegible] ўвогуле ў [illegible]

Сяргей ГРЫБ.

ПОШУК ШЛЯХОЎ

Цяжкасці палітычнага і эканамічнага характару не з'яўляюцца перашкодай для інвестыцый у аграпрамысловы комплекс Беларусі

[illegible]

[illegible] няць сур'езны вопыт унутрыэканамічных зносінаў. Азірацца са шкадаваннем назад — значыць марна губляць час.

Але ж не дае спакою і іншы клопат — праблемы ўнутрыэканамічнага характару, адсутнасць неабходных [illegible] ураджанні, будуць залежаць наступныя прамыя інвестыцыі».

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Лявонаў, выступаючы на канферэнцыі, даволі пераканаўча, хаця і лаканічна, прэзентаваў аграпрамысловы комплекс краіны, засяродзіўшы ўвагу на тых момантах, якія могуць уяўляць цікавасць для нямецкага боку — у першую чаргу, у прыватнасці, Васіль Севасцьянавіч расказаў пра выразнае і небеспадстаўнае зніжэнне выдаткаў на сельскагаспадарчую прадукцыю. І галоўны накірунак, які запатрабаваны, — новай тэхнікі, новых тэхналогій, значыць — і інвестыцый. Знешнегандлёвы, агульны абарот сельскагаспадарчай прадукцыі склаў за 8 сёлетніх месяцаў 1 мільярд 64 мільёны долараў ЗША. Экспарт — 426 мільёнаў долараў. У асноўным гэта мяса, малако, бульба, іншыя прадукты. За гэты ж перыяд рэспубліка імпартавала алей, збожжа, мінеральныя ўгнаенні — усяго на суму 638 мільёнаў долараў. Розніца паміж экспартам і імпартам існуе. Ёсць на тое аб'ектыўныя прычыны.

Міністр, гаворачы пра ўжо укладзеныя інвестыцыі, найперш назваў дапамогу нашым кадрам у асэнсаванні неабходнасці рэформаў, у рашэнні шляхоў выхаду з крызісу. Вядома, што вучобу ў Германіі прайшлі ўсе кіраўнікі райсельгасхарчаў, работнікі АПК абласнога звяна, прадстаўнікі выканаўчай улады. Распачата ажыццяўляецца праект нямецкай кансалтынгавай фірмы ў Капыльскім раёне. Асноўная мэта праекта — пошук найбольш мэтазгодных шляхоў рэфарміравання, прыстасавання да рынку гаспадарак, перапрацоўчых прадпрыемстваў, змякчэнне наступстваў пераходу да рынку на прыкладзе цэлага рэгіёна.

Дзе ж, у якіх сферах, на погляд беларускага боку, найболей патрэбныя прыдатныя інвестыцыі? У раслінаводстве, калі мець на ўвазе сумеснае вырошчванне лёну, рапсу, іншых культур. Шлях можа быць наступным — у беларускіх гаспадарках займаюцца тым, чым і займаліся. Нямецкія калегі закупляюць насенне, гербіцыды, вырашаюць іншыя арганізацыйныя пытанні. Ёсць магчымасці для супрацоўніцтва ў жывёлагадоўлі, на базе буйных комплексаў. Словам, абсягі шматгранныя, месцаў для ўкладання інвестыцый дастаткова.

У ходзе работы канферэнцыі я задаў шэраг пытанняў, звязаных з інвесціраваннем сельскай гаспадаркі самым розным удзельнікам мерапрыемства. Першым субяседнікам аказаўся кіраўнік агракамбіната «Сноў» Нясвіжскага раёна Міхаіл Карчміт.

— Чаго вы чакаеце ад развіцця кантактаў у галіне інвесціравання?

— Калі нам прапануюць новыя тэхналогіі, асабліва ў жывёлагадоўлі, то хіба ж гэта дрэнна? У нас адстае тэхніка, патрабуюць пераўзбраення комплексы. Але ж важна, пад які працэнт будуць даваць...

— У вас ужо ёсць пэўны вопыт, пэўныя інвестыцыйныя праекты?

— Чаму ж не... Мы займаемся з галандцамі, у прыватнасці, далёка ўжо не першы дзень. Будуем зараз камбікормавы завод. Гэта наша сумеснае прадпрыемства. Думаем перабудаваць птушкафабрыку.

— У якіх сферах, на ваш погляд, у найбольшай ступені патрэбны інвестыцыі?

— Патрэбны і ў раслінаводстве, і ў жывёлагадоўлі. Але ж калі ў раслінаводстве яшчэ не так дрэнна ўсё складваецца, то ў жывёлагадоўлю патрэбна рашучае ўкладанне сродкаў. Безумоўна, разумнымі шляхамі, — праз новыя тэхналогіі, рацыянальнае выкарыстанне кармоў.

— Дарэчы, як вы разлічваецеся са сваімі інвестарамі — прадукцыяй, за кошт дзяржаўнай падтрымкі?

— Мы зарабляем грошы, купляем валюту. Частку прадукцыі, напрыклад, прадаём за валюту ў Расію.

Некалькі пытанняў — намесніку дырэктара Інстытута эканомікі і інфарматыкі АПК Аляксандру Шпаку:

— Наколькі, на ваш погляд, замежныя інвестары гатовы сёння працаваць у беларускім аграпрамысловым комплексе?

— Раней лічылася, што каменем спатыкнення для кантактаў з замежнымі інвестарамі з'яўляецца пытанне прыватнай уласнасці на зямлю. Але сёння размова ідзе пра ўнясенне ў закон змяненняў аб праве ўласнасці на зямлю. Дазваляецца набываць замежным інвестарам зямлю ў прыватную ўласнасць — пад аб'екты, якія прыватызаваны, і пад народнагаспадарчыя аб'екты. Змены ўнесены, але закон не прыняты. Пры ўмове яго прыняцця, лічу, будзе створаны спрыяльны інвестыцыйны клімат для замежных землекарыстальнікаў. Гэта адзін бок пытання. Сёння ж, трэба заўважыць, замежныя інвестыцыі ў нашу сельскую гаспадарку вельмі і вельмі нязначныя. Але, думаю, заходнім партнёрам не трэба асабліва перажываць. Інвестыцыі, асабліва гэта датычыць перапрацоўчай галіны, акупныя.

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Лявонаў, адказваючы на пытанні для нашай газеты, наступным чынам выказаўся пра канферэнцыю:

— Вынік мне бачыцца толькі станоўчы. У нас ужо ёсць практычныя праекты, яны працуюць. Вы ўжо чулі пра Капыльскі раён... Але самае галоўнае — і мне прыемна, што нямецкія калегі звярнулі на гэта ўвагу, — дзелавое супрацоўніцтва ні па якіх палітычных матывах згортвацца не павінна.

Значыць, нямецкія аграрнікі вераць нам, спадзяюцца на стабільнасць у нашай краіне. Значыць, іншага шляху, як працаваць, не застаецца і ў нас.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ШТО «ФОРД» У ДАЛЕЙШЫМ НАМ РЫХТУЕ?

Нядаўна па радыё прагучала інфармацыя наконт таго, што, маўляў, кампаніяй «Форд Юніён» (рэгіянальным прадстаўніком знакамітай амерыканскай кампаніі «Форд мотарз») пачаўся набор людзей для работы на аўтамабілезборачным канвееры. Вядома, адразу ж мноства зацікаўленых кінуліся шукаць свой шчаслівы шанц. Аднак інфармацыя з радыёэфіру аказалася не зусім дакладнай. Уся справа ў тым, што зараз «Форд Юніён» праводзіць наём адміністрацыйнага персаналу і інжынераў, якія будуць працаваць у офісе, так заявіў на прайшоўшай нядаўна прэс-канферэнцыі генеральны дырэктар кампаніі Міл Кэмпбел. Наём працоўных на зборку пачнецца толькі ў студзені 1997 года, а ў снежні сёлетняга плануецца прыняць невялікую колькасць тэхнічнага і абслуговага персаналу, каб забяспечыць для гэтай катэгорыі асоб неабходны трэнінг ужо да моманту ўстаноўкі абсталявання.

Да пачатку зборкі плануецца наняць 100—110 чалавек і ў дадатак да працоўных будуць прыняты каля 30 чалавек адміністрацыйнага персаналу. Пакуль яшчэ прадстаўнікамі «Форд Юніён» не вызначаны адукацыйны эквівалент, які неабходны для таго, каб стаць удзельнікам зборкі. Але ўжо зараз сярод абавязкаў былі названы магчымасць правядзення пэўных статыстычных разлікаў, кантролю, добрая камунікабельнасць.

Асноўная арыентацыя — на маладых спецыялістаў. «Форд Юніён» мяркуе прыцягнуць менавіта тыя працоўныя кадры, якія б былі здольны актыўна ўдзельнічаць у працэсе вытворчасці. «Чыста фізічная сіла нам не патрэбна», — такія словы прагучалі на прэс-канферэнцыі з вуснаў Аляксея Ваганава, генеральнага дырэктара фірмы «Лада ОМС», беларускага партнёра «Форда». Ад кандыдатаў, жадаючых удзельнічаць у вытворчасці беларускіх «Фордаў», перш за ўсё запатрабуюць пісьмовую заяву, а таксама прапануюць запоўніць анкету.

Пасля чаго будзе праведзена гутарка з найбольш верагоднымі прэтэндэнтамі. Ад якіх, дарэчы, будуць запатрабаваны неабходныя рэкамендацыі — у асноўным, вядома, прафесіянальныя (з апошняга месца працы). З самага пачатку будзе праведзена неабходнае абучэнне кадраў. Па-першае, знаёмства з прынцыпамі работы кампаніі, з тымі задачамі, якія неабходна будзе вырашаць у далейшым. Пасля чаго — тэхнічныя веды, якія будуць атрыманы на польскім заводзе «Форда» ў Плоцку. Такім чынам працоўныя набудуць неабходны вопыт.

Вельмі прыемна, вядома, што арганізатары сумеснага амерыканска-беларускага праекта прыцягваюць да работы менавіта айчынных працаўнікоў (той жа «Макдональдс» карыстаецца паслугамі фінскіх будаўнікоў, у той час як на пляцоўцы ў Абчаку працуюць беларусы). Да таго ж адной з задач, якую ставіць перад сабой «Форд Юніён», адной з састаўных яе агульнай палітыкі з'яўляецца перш за ўсё рэзонная аплата працы. У далейшым для працуючых плануецца арганізаваць шэраг ільгот (напрыклад, на пакупку аўтамабіля). Беларускія «форды», якія будуць адпавядаць самым сучасным замежным аналагам, па свайму кошту будуць канкурэнтаздольныя з вядомымі расійскімі «Жыгулямі» (пры гэтым не трэба адкідваць і належную якасць).

Першыя 150 чалавек, што будуць прыняты кампаніяй «Форд Юніён», гэта толькі пачатак вялікага шляху. Бо да іх далучацца і шэраг людзей, якія працуюць у сумежных вытворчасцях, — у тэхнічным абслугоўванні (намячаецца арганізацыя належнай сеткі сервісных станцый), у арганізацыі харчавання і гэтак далей. У перспектыве — дабаўленне да аўтамабільнай іншых вытворчасцей, прыцягненне ў Беларусь вялікай колькасці замежных інвестараў.

Неабходна ўжо зараз думаць пра будучыню. Відавочна, што «Форд Юніён» сваёй дзейнасцю паспрыяе павелічэнню эканамічнага патэнцыялу нашай дзяржавы.

Таму неабходна, каб замежныя фірмы ў выніку свайго знаёмства з сітуацыяй у Беларусі зрабілі станоўчыя высновы наконт супрацоўніцтва з намі. Інакш проста нельга.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

«У НАС НАРМАЛЬНА СЛУЖЫЦЦА...»

Ужо мой трэці сын пайшоў служыць у армію, таму магу параўнаць, як служылі раней і цяпер. Параўнаць хоць бы з нядаўнім часам, калі два старэйшыя знаходзіліся ў радах Савецкай Арміі і не было спакою ўдзень, не было сну ўначы: такія ж маці, як я, атрымлівалі свінцовыя труны з Афганістана. Нават страшна ўспамінаць...

Цяпер, дзякуй Богу і нізкі паклон уладам рэспублікі, нашы сыны служаць у роднай Беларусі, і кашмар Чачні — не ў нас. Мы спакойныя.

І ўсё ж часам трывожна становіцца, калі паслухаеш тых, хто ўжо адслужыў. А інтэрв'ю ваеннага пракурора рэспублікі Анатоля Глюкава («Звязда» за 30 ліпеня г. г.) проста ўзрушыла. На жаль, у арміі ёсць і зараз такія, што ходзяць са «звярыным выскалам». Як жа паводзіць сябе побач з такімі звычайным, нармальным хлопцам? Спаць у адной казарме, сядзець за адным сталом... А то яшчэ некаторыя кажуць: «Страшная цяпер армія». Але, падумала, лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць.

Першае знаёмства з часцю, дзе служыць сын, адбылося на прыняцці прысягі. А да гэтага атрымалі ад сына ліст, у якім ён пісаў: «...мяне ніхто не чапае, і камандаванне ў нас добрае».

На тэрыторыю ваеннага гарадка ў Калодзішчах нас, бацькоў, бабуль, дзядуль, блізкіх, сяброў вайскоўцаў, прапусцілі проста так: ніхто не правяраў дакументаў, не запісваў, хто ты і да каго прыехаў. Раней так не было. Здзівіла яшчэ адно: шчырыя, адкрытыя гутаркі начальства з бацькамі на агульным сходзе, які заўсёды праводзіцца пасля прысягі. Задавалі, на мой погляд, дробязныя пытанні тыпу: як пакарыстацца воіну паслугамі акуліста, стаматолага і г. д., аднак і яны адразу ж вырашаліся. Паступова адчула сябе як дома, і маё нервовае напружанне спала, знікла. У гэты час цывільная моладзь хадзіла-бегала туды-сюды, усё ім было цікава: пабачылі, як салдаты могуць хутка наладзіць сувязь у палявых умовах, аглядалі тэхніку... А мы — бо што нас, маці, найбольш цікавіць? — агледзелі сталовую і казармы. Убачылі: ложкі стаяць у «адзін паверх», і гэта таксама спадабалася; тут жа, у казарме, — вучэбны клас, тэлевізар, акварыум. Усё проста і акуратна. І нічога не ўбачыла страшнага. Наадварот, заўважыла ў вачах сяброў сына добрую зайздрасць у час прыняцця прысягі да тых, хто стаіць у строгіх шэрагах.

Хачу сказаць бацькам, якія «схавалі» ад арміі сваіх дзяцей за рознымі даведкамі, выкупілі іх за хабар: дарэмна так робіце, дарэмна траўміруеце іх псіхіку, «праводзячы» праз розныя «псіхушкі» і іншыя бальніцы. Цяпер нярэдка маладыя людзі пытаюцца адзін у аднаго: «Ты што, «адмазаўся» ад арміі?» Непрыгожыя словы, асабліва ў адносінах да тых, хто зараз служыць, ім нават крыўдна іх слухаць. Нібы тыя, што «адмазаліся», лепшыя, нейкая «эліта», а хто трапіў у армію — значыць нейкія дэбілы. Іншы раз нават чуеш: «А хто зараз служыць у арміі? Адны «зэкі». І так ствараюць грамадскую думку аб арміі — негатыўную. Дык пасылайце сваіх «разумных, харошых, здольных», тады і армія зменіцца, калі не задавальняе цяперашняя.

Скажу з усёй шчырасцю: нармальныя хлопцы служаць разам з маім сынам. З ветлівага дазволу начальніка Цэнтральнага вузла сувязі падпалкоўніка Аляксандра Аляксандравіча Дубровіна зноў пабывала ў гэтай часці. Большасць асабовага саставу ЦВС — мінчане: Дзіма Грыбок, Андрэй Панамароў, Міша Ламака, Алег Даніловіч, Андрэй Кочураў і іншыя; двое з Мазыра — Саша Ігнаценка і Сяргей Дук (вадзіцель). Усе прыйшлі служыць па воінскаму абавязку, ніхто не шукаў абходных шляхоў, каб пазбавіцца ад арміі. Яны выглядаюць здаровымі, моцнымі, дужымі, адным словам, спартыўныя хлопцы і выгадна адрозніваюцца ад сваіх аднагодкаў, якія не служылі. Начальнік тэлефоннага цэнтра маёр Баранаў называе сваіх падапечных «Шварцэнегерамі», і відаць, што хлопцам гэта імпануе.

З некаторымі гутарыла. Міша мне здаўся спакойным і сціплым, Саша Ігнаценка — хлопцам з высокім інтэлектам і жывымі, хітраватымі вачамі, Алег Даніловіч — спагадлівым, Андрэй Кочураў — разважлівым. А разважалі мы пра «дзедаўшчыну», пра якую так шмат гавораць у грамадстве. «Калі я прыйшоў з «вучэбкі», — расказваў Андрэй, — некаторыя мне гаварылі: «Цяпер ты можаш «пакамандаваць» маладымі, як «камандавалі табой». А я сказаў: «На кімсьці трэба спыніць «дзедаўшчыну», няхай яна скончыцца на нас»... «Дзедаўшчыны» ў нас няма, мы ўсе роўныя», — услед за Андрэем запэўніваў Саша.

Можа, не ўсюды так, не магу сказаць. Сувязісты, пэўна, крыху іншыя. Хто прыйшоў на службу пасля інстытута, хто — пасля тэхнікума ці вучылішча, былі блізкімі ў хлопцаў і школьныя захапленні. У іх ёсць жаданне ўдасканаліць свае веды. А яшчэ мне здаецца, добрае ў першую чаргу пераймаецца ад камандавання. Афіцэры ЦВС — не проста ваенныя «чыны», яны яшчэ выдатныя спецыялісты, ад якіх многаму можна навучыцца. Не маглі яны не заўважыць высокай кампетэнтнасці начальніка тэлефоннага аддзялення капітана Юрыя Пятровіча Бахара, яго адданасці справе, сур'ёзных адносінаў да службы.

А калі нешта вярэдзіць душу, узнікаюць асабістыя праблемы, таксама ёсць да каго звярнуцца — калі ласка, намеснік начальніка ЦВС па выхаваўчай рабоце маёр Дзмітрый Якаўлевіч Крывякін, які абсалютна даступны для кожнага салдата. Пра каго ні пыталася, ён кожнага ведае: і хто бацькі, і дзе працуюць ці не працуюць, ведае схільнасці салдат, адкрыты да шчырай гутаркі.

Я засталася вельмі задаволенай: мой сын трапіў у добрую часць, і цяпер толькі ад яго залежыць, як заслужыць аўтарытэт, павагу і ўвагу таварышаў, стаць адмысловым спецыялістам-сувязістам і ўмелым салдатам.

Праз пару месяцаў — асенне-зімовы прызыў. Адпраўляючы сына ў армію, настаўляйце на добрае: таварыскія адносіны, узаемапавагу. Не рабіце так, як зрабіла адна маці. Вось які наказ дала яна сыну: «Бі, сынок, у морду кожнага першы». Самі вы, бацькі, такім чынам і ствараеце «дзедаўшчыну». Можа, з такіх «сынкоў» і атрымліваюцца «дзяды» — з турэмнымі замашкамі.

А найперш трэба падумаць: як для іх скончыцца служба? Яшчэ хачу запрасіць бацькоў, чые сыны служаць у войску, да працягу размовы: дзе і як служаць вашы дзеці, ці ўзнікалі ў іх праблемы на першым часе, патрэбна была ваша дапамога ці вы лічыце такія клопаты лішнімі? Што да мяне, то было прыемна атрымаць пісьмо ад сына, калі мы яшчэ не ведалі месца яго службы, у якім ён напісаў: «Не хвалюйся, мама, у нас нармальна служыцца».

Зінаіда МАЛАШЭВІЧ, маці салдата, г. Мінск.

ПОГЛЯД

«МЯСНЫ ШЛЯХ», ці Адзін дзень з жыцця Камароўкі

Прадмова рэдакцыі

У газету прыйшоў чалавек, які гандлюе на Камароўцы мясам. Неверагодныя рэчы расказаў! Мы папрасілі ўсё выкласці на паперы. Пасля доўгіх ваганняў-сумненняў усё-такі адважыўся напісаць -- па зразумелых прычынах, пад псеўданімам.

Мы цудоўна разумеем, што гэтаму чалавеку ўсё настолькі надакучыла, што ў парыве эмоцый ён, магчыма, дзесьці і перагінае палку. Аднак жа нездарма гаворыцца: няма дыму без полымя.

Зрэшты, мяркуйце самі...

Кожны ўжо ведае, што адзін з фактараў добрага здароўя і працаздольнасці -- якаснае харчаванне. Я не маю на ўвазе разнастайныя садавінныя і малочныя дыеты, харчовыя дабаўкі. Якая сям'я зараз абыходзіцца без мяса? Яшчэ мала ў Беларусі «чыстых» ці «частковых» вегетарыянцаў, таму кожнаму хочацца з'есці на абед нейкі шматок мяса ці сала.

Мае знаёмыя даўно ўжо абыходзяць магазіны: там цікава хіба толькі экспрэсіяністу, якога захапляе небывалы колер курыцы, ці каменне замест пельменяў. Многія шыбуюць на базар, прытрымліваючыся правіла: «лепш менш, ды больш якасна» і не баючыся, што цэны «пакусаюць». А яны не маленькія: 1 кг свініны (у залежнасці ад катэгорыі) каштуе ад 35.000 да 50.000 рублёў, ялавічыны -- ад 30.000 да 55.000, цяляціны -- ад 30.000 да 60.000, пячонка ў залежнасці ад якасці -- 40.000--60.000. Калі вы сустрэнеце язык, то кошт цялячага дасягае 70.000, а свінога -- 50.000 тысяч рублёў.

Мы любім лаяць прадаўцоў, прадпрымальнікаў, не заўсёды ведаючы, чаму складваецца такое становішча з цэнамі, які шлях праходзіць тое самае мяса, пакуль трапіць на базарны прылавак.

Шлях гэты не просты і зусім не вясёлы. Не будзем удавацца ў тонкасці -- уявім дзень звычайнага прадпрымальніка з Камароўкі.

Да адкрыцця (з 1 кастрычніка -- з 8.00) у 7.45 ля варот збіраецца чарга. Вартаўнік (за 15.000 рублёў з кожнага) запускае людзей. Першая партыя заўсёды за грошы, хто не заплаціць -- не пусцяць. Калі адчыняюцца дзверы, усе бягуць з каляскамі па выбітай дарозе з мясам да лабараторый, каб «закляйміць» мяса. Тут адбываецца сартаванне людзей. Ля ўваходу стаяць два адміністратары рынку і выстройваюць асобную чаргу (за грошы) на клеймаванне. Гэта першы падзел людзей на «блатных» і «смяротных». «Смяротны» можа прастаяць са сваёй тушай да абеду. Усё гэта запланавана на «адпампоўванне» грошай.

Пры ўездзе ў лабараторыю кладзеш мяса на стол (заўважце: на рынку працуюць амаль адны жанчыны, неапрацаваныя тушы вялікай свінні, цяляці ці падцёлка важаць самі ўявіце колькі), але ж у «блатных» аналіз бяруць прама з каляскі. Простыя людзі, усцягнуўшы тушу на стол, могуць прастаяць, чакаючы ўрача, некалькі гадзін: калі не «паднесці» колькі належыць па «таксе», у ваш бок ніхто з урачоў нават і не зірне.

Далей трэба выстаяць чаргу ў касу -- «прабіць» месца. Тут ніколі не выдаецца належнае па інструкцыі спецадзенне, кошт якога ўваходзіць у абанементную плату (белыя шапачкі і фартухі). Дарэчы, кошт абанемента -- 2.300.000 (23 мінімальныя зарплаты ў месяц). Акрамя таго, за месца яшчэ кожны дзень ідзе асобная аплата. Цікава было б даведацца, на якіх падставах выводзіцца сума абанементнай платы?

Кожны панядзелак (у адзіны адпачынак!) трэба прыязджаць, у адпаведнасці з загадам, для мыцця працоўнага месца і падлогі. А потым абавязкова пайсці ў арганізацыйны аддзел і адзначыцца ў спісе аб выкананні. Санкцыі -- аж да пазбаўлення месца, таму што панядзелак павінен быць адпрацаваны (незалежна ад стану здароўя). Член аргаддзела кожны дзень правярае наяўнасць у кожнага белага халата, фартуха і шапкі, прасціны для накрывання туш -- тых самых рэчаў, якія ніхто ніколі не выдае ў касе. Штрафы за адсутнасць чаго-небудзь -- да 50.000 рублёў.

Заклеймаваную тушу з лабараторным аналізам і аплатай у касу выводзяць у народ. Пры выездзе ў гандлёвую залу стаяць кантралёры і правяраюць дакументы на тушу: 1) аплата ў касу (у залежнасці ад вагі і месца 150.000--200.000 у дзень); 2) лабараторны аналіз з указаннем нумара рабочага месца, рада. Але ж «сваіх» тут пускаюць без дакументаў, бо ведаюць, што ў канцы дня з імі «разлічацца».

Наступную «кішэню», акрамя аплаты ў касу, напаўняюць секару. Тут свая «такса»: туша цяляці -- 20.000, свінні -- 30.000, ялавічына -- 50.000. Без аплаты ў касу і без абмежавання вагі секар гатовы зрабіць любы аб'ём работы за пэўную «стаўку».

З падрыхтаванай да продажу тушай ідзеш на свой «пятачок» у адзін квадратны метр, моцна абрэзаны ў апошні час. З ранейшых двух месцаў зрабілі тры, з трох радоў атрымалася сем.

Такім чынам, пачынаючы працоўны дзень, яшчэ не прадаўшы ніводнага кавалачка мяса, ужо маеш даўгі, прыкладна 300.000 рублёў. Калі ўлічыць, што не кожны дзень бывае ўдалы гандаль, а мяса ў халадзільніку можна захоўваць усяго суткі, для прадпрымальніка калі-небудзь справа можа закончыцца цяжка: акрамя аплаты за маразільныя паслугі (600 руб. за 1 кг) яшчэ раз трэба пацвердзіць дакументы на праверанае ўжо мяса ва ўрача, з дакументамі аб захоўванні мяса ў халадзільніку Камароўскага рынку, прабіць па касе рэшткі.

Нарэшце, раскладваеш мяса і пачынаеш гандляваць. Трэба сачыць за мясцовым «кантынгентам» -- зладзеямі, жабракамі, калекамі, якія таксама кожны дзень выходзяць на «работу». Яны такія спрытныя, што заўсёды трэба кантраляваць сітуацыю. Цэлы дзень прадавец знаходзіцца ў напружаным стане: штодзённае «адшпільванне» да работы, зладзеі і жабракі, абарот пакупнікоў, пастаянны рух даводзіць да галавакружэння.

Цяжкія фізічныя і маральныя фактары абумовілі жорсткі адбор супрацоўнікаў: тут працуюць дужыя і вынослівыя людзі. Акрамя таго, трэба мець моцны «тыл» і падтрымку. Бывае, што месячная зарплата намнога ўступае плаце за месца.

Пераважная большасць прадаўцоў -- жанчыны, якія працуюць са шматкілаграмовымі тушамі, усе абавязкі грузчыка яны выконваюць самі. Цэлы дзень без абеду і адпачынку -- адлучыцца немагчыма нават «па патрэбе»... Скідкі на асабістыя праблемы не робіць ні адна праверка: усе даўно ведаюць, якое гэта «пажыўное» месца -- Камароўка, як любіць яго падатковая інспекцыя, розныя рэвізійныя праверкі і іншыя, -- акрамя нас, пакупнікоў.

Я думаю, гэты артыкул дапаможа вам крыху інакш зірнуць і на людзей, якія працуюць на рынку, і зразумець, чаму не па днях, а па гадзінах расце кошт на мяса. Класікі эканомікі даўно ўжо вывелі аксіёму: рынак рэгулюе цэны. Не проста так «з раскошы» баставалі нядаўна ўсе рынкі Мінска. Спадзяёмся, што яны думалі не толькі пра сябе...

А. Б.

Пасляслоўе рэдакцыі

Друкуючы гэта пісьмо мы хацелі б удакладніць, ці ведаюць аб усім выкладзеным тыя адказныя асобы, якім па службе належыць аб усім ведаць: адміністрацыя рынку, праваахоўныя органы, санстанцыя, гарадскія ўлады?

Безумоўна, рынак ёсць рынак. Аднак чаму пакупніку за «рынак у рынку» трэба плаціць утрая даражэй?..

РЭПАРЦЁР АТРЫМАЎ ЗАДАННЕ

... укласці 3 мільёны рублёў

Нават заўзятыя прыхільнікі філасофіі «жыві адным днём», не могуць пагадзіцца з адсутнасцю сродкаў да існавання. Бо без іх само існаванне немагчыма. Ну, а калі ёсць магчымасці адкласці якую-небудзь капейку, думаю, ніхто ад гэтага не адмовіцца.

Я «наскрэбла» 3 мільёны. Рублёў, зразумела. Сума нязначная, вядома, але ж і яна не з неба звалілася. Пачала такім чынам вырашаць жыллёвую праблему. Разумею, што гучыць недарэчна: маючы толькі 3 мільёны, гэтую праблему не вырашыш. Але ж грошы павінны рабіць грошы -- такі закон эканомікі.

Спачатку я вырашыла іх ўкласці, каб працэнты «набягалі». Фінансавым кампаніям свае зберажэнні даваяраць не стала. Прэс-служба Нацыянальнага банка рэспублікі паведамляла, што зараз адбываецца перарэгістрацыя гэтых устаноў і за знікненне ўкладаў ніхто адказнасці несці не будзе. Да гэтай пары толькі фінкампанія «Трансферінвест» заяўку на перарэгістрацыю падала. Так што засталіся банкі. І што ж тут? Спярша звярнулася ў Ашчадбанк «Беларусбанк». Па старой звычцы. На жаль, хоць Ашчадбанк і прыме любы ўклад, нават 500 тысяч рублёў, працэнтныя стаўкі мне не прыйшліся даспадобы. Уклад жа на тры месяцы -- 32 працэнты гадавых. Дробязь. Банк «Белбалтыя» за той жа тэрмін дае 52 працэнты. Праўда, ён прымае суму ад 3 мільёнаў (якраз столькі ў мяне ёсць). «Белзнешэканомбанк» прапануе 20 працэнтаў. Шляхам нескладаных арыфметычных дзеянняў, падлічыла, на колькі ж пацяжэе мая скарбонка. Нават калі ўкласці грошы пад самы высокі працэнт, які прапануюць банкі (70), за тры месяцы я атрымаю 180 тысяч рублёў. Гэта сума з разраду «абнімі і плач». Што за яе купіш? Хоць цэны быццам бы і не «растуць», аднак адну і тую ж каўбасу я ледзь не штодзень па новай цане купляю. Зразумела, больш высокай. А што калі ў валюце ўкласці? Трох мільёнаў дастаткова на 210 долараў. Такую суму на 3 месяцы бяруць пад 15 працэнтаў гадавых. Прыкінуўшы зноў, колькі гэта будзе ў месяц, атрымала «вялізную» суму -- 2 долары за месяц. Уяўляеце, якая цана за штодзённы страх на працягу трох месяцаў за свае «кроўныя»?

Шэсць долараў! Ну не, лепш тады купіць гэтыя «баксы» ды пакласці дома ў самую звычайную панчоху. Ці нейкую рэч набыць, хоць гэта і банальна. Затое вашы грошыкі інфляцыя не з'есць.

Я ж пакуль купіла долары. Якраз 210. Вырашыла: няхай пакуль паляжаць. Есці не просяць, месца не займаюць. Не знайшла я ім пакуль прымянення. Днямі знаёмая папрасіла пазычыць. Пад працэнты. Хутчэй за ўсё, не адмоўлю. Яна чалавек надзейны, ды і мне будзе карысць. Сума мне вернецца крыху большая, чым калі б грошы ў банку ляжалі. Я ўжо нават ведаю, што на працэнты куплю.

Жанна КАТЛЯРОВА.

ХОДЗЯЦЬ ЧУТКІ, ШТО...

...нацыянальны турыстычны канцэрн «Белінтурыст» «захапіў» маёмасць замежнай дзяржавы

Напрыканцы сёлетняга турыстычнага сезона прэзідэнцкім указам некалькі спецыялізаваных прадпрыемстваў розных формаў уласнасці былі аб'яднаны ў нацыянальны турыстычны канцэрн «Белінтурыст». У састаў новага прадпрыемства сярод іншых увайшоў «Беларускі комплекс «Юнацтва», больш вядомы нашым грамадзянам як Мінскі міжнародны турыстычны цэнтр «Юнацтва».

Менавіта права ўласнасці на апошні да нядаўняга часу аспрэчвалі дзве дзяржавы -- Беларусь і Расія. «Падзел» маёмасці расцягнуўся на некалькі гадоў, ператварыўшыся ў судовую справу. Прычым інтарэсы беларускага боку ў Вышэйшым гаспадарчым судзе адстойвалі Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта РБ і Міндзяржмаёмасць Беларусі. Суд прызнаў права ўласнасці на ММТЦ «Юнацтва» за рэспублікай. Але гэтае рашэнне некалькі разоў аспрэчваў другі бок -- маскоўскае АТ «Спутник», якое раней лічылася гаспадаром прывабнага месцейка на Заслаўскім вадасховішчы. Суду выпала нялёгкая задача дакументальна пацвердзіць, што долевае фінансаванне будаўніцтва Мінскага МТЦ «Юнацтва» праводзілася за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту Беларускай ССР.

У тыя часы, калі «падзел» маёмасці ахапіў абсягі «вялікага і магутнага», дзяржавы -- удзельніцы СНД падпісалі пагадненне «Аб узаемным прызнанні правоў і рэгуляванні адносінаў уласнасці». Менавіта на аснове гэтага дакумента бакі згадзіліся садзейнічаць захаванню раней створаных прадпрыемстваў, устаноў і таварыстваў з долевай або сумеснай формай уласнасці (у тым ліку і АТ) краін Садружнасці. Беларусь не магла б і марыць аб «Юнацтве», калі б у будаўніцтва цэнтра прыцягваліся сродкі прадпрыемстваў рэспубліканскага і былога саюзнага падпарадкавання, размешчаных на тэрыторыі цяпер ужо замежных дзяржаў. І тут, як гаворыцца, чужога нам не трэба, але і свайго не аддадзім. Апошняе пацвярджае распараджэнне Саўміна БССР аб выдзяленні ў лютым 1974 года з рэспубліканскага бюджэту на будаўніцтва ММТЦ «Юнацтва» 1,6 млн. рублёў. Юрысты лічаць, што гэтая акалічнасць дазваляе Беларусі прэтэндаваць на аб'ект, нават калі б ён знаходзіўся на тэрыторыі іншай краіны СНД.

Сяргей КУРКАЧ.

НА ЧЫГУНЦЫ НОВЫЯ АХВЯРЫ

Інфармацыя пра здарэнні на Беларускай чыгунцы за апошнія дні вельмі падобна на франтавыя зводкі. Мяркуйце самі...

Так, толькі 18 кастрычніка па розных прычынах пад коламі паяздоў аказалася 8 чалавек. Для траіх з іх гэты дзень стаў апошнім, а чацвёра былі дастаўлены ў бальніцу з рознымі цяжкімі траўмамі. Яшчэ адзін труп з прыметамі чыгуначнай траўмы быў знойдзены на пуцях машыністам электрапоезда «Мінск--Асіповічы».

Надзея НІКАЛАЕВА.

17.11 1992 г. у нашай газеце быў апублікаваны артыкул «З мафіяй нічога не зробіцца, калі яна «кавалак адваліць».

У ім ішла размова аб работніках міліцыі, якія былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Не адзін год спатрэбіўся правасуддзю, каб устанавіць, што ўчынілі Касевіч Валяр'ян Браніслававіч, Кланевіч Анатоль Мікалаевіч і Аляшкевіч Іван Зянонавіч і як правільна кваліфікаваць іх дзеянні.

Паколькі аўтар матэрыялу «ішоў па гарачых слядах» і не мог праверыць звесткі, прадастаўленыя яму следствам, не ўсе яны аказаліся дакладнымі. З чэрвеня 1996 года суд Савецкага раёна г. Мінска прызнаў выраз, што «тройца атрымлівала хабар» нясл авіць гонар і годнасць істцоў і не адпавядае рэчаіснасці.

«Я ШЧЫРА ГАНАРУСЯ ПАДТРЫМКАЙ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На стварэнне эканомікі, якая спалучае перавагі сучаснай высокаразвітой рыначнай гаспадаркі з эфектыўнай сацыяльнай абаронай грамадзян, адзначыў кіраўнік дзяржавы, нацэлена прэзідэнцкая Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі да 2000 года. Рэалізацыя гэтай праграмы — рэальны шлях да паляпшэння ўмоў жыцця ўсяго народа, у тым ліку і ветэранаў.

Але, на думку Аляксандра Лукашэнкі, можна было б зрабіць намнога больш, калі б усе галіны ўлады, усе асноўныя палітычныя сілы працавалі дружна на карысць людзей. На жаль, сказаў ён, Прэзідэнт увесь час вымушаны пераключаць увагу на палітычныя разборкі, у якія яго ўцягваюць іншыя галіны ўлады. Справа ў тым, што дзеючы варыянт Канстытуцыі дае магчымасць і Вярхоўнаму Савету, і Канстытуцыйнаму суду аказваць пастаянны націск на Прэзідэнта, на выканаўчую ўладу, не несучы пры гэтым ніякай адказнасці за стан спраў у краіне.

Таму я і выступіў з ініцыятывай правядзення канстытуцыйнай рэформы. Я хачу змяніць закон, каб паставіць усё на месца, навесці парадак.

Вы думаеце, вярхі Вярхоўнага Савета ацанілі добрую волю Прэзідэнта? Не. Яны з новай сілай працягваюць працаваць на зрыў рэферэндуму. Іх мэта — не даць простым людзям самім вырашыць, па якіх законах ім жыць. Невялікая група палітыкаў, якая прысвоіла сабе выключнае права называцца дэмакратамі, больш за ўсё баіцца свайго народа, баіцца народнага галасавання.

У якасці ўдарнай сілы, падкрэсліў Прэзідэнт, імі выкарыстоўваецца Канстытуцыйны суд, які не толькі не адмовіўся ад непрымірымай і прадузятай лініі ў адносінах да Прэзідэнта, але нават узмацніў яе. Фактычна суд стаў адкрыта займацца палітыкай, што прама супярэчыць яго канстытуцыйнаму статусу.

Асабліва відавочным гэта стала пасля таго, як Канстытуцыйны суд узбудзіў вытворчасць па пытанню аб рэферэндуме.

Вы толькі падумайце: па просьбе Шарэцкага Канстытуцыйны суд разглядае пытанне аб законнасці пастановы Вярхоўнага Савета, падпісанай гэтым жа Шарэцкім!

Выкарыстоўваючы права, прадастаўленае мне майскім рэферэндумам, я мог бы распусціць Вярхоўны Савет, але я гэтага не зраблю. Я ўчора прыняў Зварот да народа, у якім падкрэсліваю, што поле для кампрамісу яшчэ існуе. Але я нікому не дазволю перашкодзіць волевыяўленню народа. Калі рэферэндум пройдзе ў спакойнай абстаноўцы і народ падтрымае Прэзідэнта, запатрабуецца зусім няшмат часу, каб жыццё ўвайшло ў нармальнае рэчышча.

Сёння ідзе барацьба за ўладу. Апазіцыя імкнецца захапіць фабрыкі і заводы, распрадаць зямлю ў прыватныя рукі, выселіць людзей на хутары. Таму ім, лібералам і нацыяналістам, патрэбна шукаць нейкія звілістыя шляхі для таго, каб прабрацца да ўлады. Мне, сказаў кіраўнік дзяржавы, гэта не патрэбна. Я выбіраю самы сумленны, адкрыты і дэмакратычны шлях — шлях парады з народам. І з гэтага шляху я не звярну, які б націск на мяне ні аказваўся ўнутры краіны або з-за мяжы.

Перакананы, вы правільна разумееце палітычную сітуацыю, што склалася ў рэспубліцы, і зробіце правільны выбар на маючым адбыцца рэферэндуме. Я вас агітаваць не буду, папрашу аб іншым, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Не ўсе нашы грамадзяне, на жаль, вызначаюцца высокай палітычнай культурай. Дапамажыце ім зразумець, што ад выбару, які будзе зроблены на рэферэндуме, залежыць і іх будучыня, і будучыня іх дзяцей. Дапамажыце і ім зразумець сутнасць прапаноў Прэзідэнта і яго праціўнікаў. Я вельмі разлічваю на вашу падтрымку.

АДНЫМ СКАЗАМ

- За 9 месяцаў гэтага года ў рэспубліцы адбылося **5085 дарожна-транспартных здарэнняў**, у якіх 1177 чалавек загінулі і 5396 атрымалі раненні.
- На ўліку ў органах унутраных спраў знаходзяцца **2 тысячы 419 наркаманаў**, пры гэтым толькі за 1995 год пастаўлены на ўлік 1074 чалавекі.
- Французскія ўрачы ўстанавілі, што курэнне **для знешнасці жанчын куды больш небяспечнае**, чым для мужчын: у прадстаўніц прыгожага полу скура на твары хутчэй старэе, губляе эластычнасць, у куточках рота і вачэй з'яўляюцца заўчасныя маршчынкі.
- За апошні месяц сума ўкладаў насельніцтва ў камерцыйных банках **зменшылася на 300 мільярдаў**, а на 1 кастрычніка яна складала 7 трыльёнаў 800 мільярдаў рублёў.

ЧЭКАВАЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ: БЕЛАРУСКІ ВАРЫЯНТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Да першага студзеня наступнага года Міндзяржмаёмасць павінна скласці пералік прадпрыемстваў, якія будуць падлягаць чэкавай прыватызацыі.

— У адпаведнасці з гэтай нормай закона такі пералік неабходна збалансаваць пад усе нявыкарыстаныя чэкі. Паводле папярэдніх падлікаў, будзе выстаўлена на продаж акцый на 440 млн. чэкаў. Але проста скласці пералік мала, па ім трэба правесці раздзяржаўленне гэтых прадпрыемстваў. Неабходна, каб ён быў прыняты да абавязковага выканання. У той жа час на Усебеларускім народным сходзе Прэзідэнт зноў заявіў аб тым, што прыватызацыя будзе насіць чыста добраахвотны характар — гэта значыць толькі па ініцыятыве працоўнага калектыву. А, як паказвае практыка, жаданне працоўнага калектыву на 90 працэнтаў залежыць ад волевыяўлення кіраўніка. У сваю чаргу дырэктары вельмі асцярожна ставяцца да прыватызацыі, а да чэкавай — тым больш. Адміністрацыям прадпрыемстваў больш выгадна прыватызавацца пад якога-небудзь інвестара, разлічваючы на рэальную фінансавую падтрымку. Любымі метадамі дырэктары «адбіваюцца» ад чэкавай прыватызацыі. Калі такая сітуацыя захаваецца і ў наступным годзе, чэкавая прыватызацыя пацерпіць катастрофу.

— Якім, у такім выпадку, будзе лёс нявыкарыстаных чэкаў?

— Чэкі «Маёмасць» знаходзяцца ў абарачэнні толькі да ліпеня 1999 года. Пасля гэтага тэрміну дзяржава абавязана выкупіць нявыкарыстаныя чэкі ў насельніцтва. На гэтыя мэты, паводле нашых разлікаў, спатрэбіцца да 20 трыльёнаў рублёў. І гэта толькі калі браць намінальны кошт чэкаў (35 тыс. руб.). А калі ён будзе праіндэксаваны ў сувязі з маючай адбыцца пераацэнкай фондаў на 1 студзеня 1997 года? У гэтым выпадку чэк зможа падаражэць мінімум яшчэ ў 3 разы. Тады дзяржаве для выкупу спатрэбіцца не 20, а ўсе 60 трыльёнаў рублёў.

— Многія пажылыя людзі, ужо атрымаўшы чэкі, так і не ведаюць, што з імі рабіць. У вёсках памяняць чэкі на акцыі практычна немагчыма. Нашы бацькі і дзяды з задавальненнем аддалі б чэкі сваім дзецям. Але аказалася, што выкарыстаць чэкі сваякоў напрамую немагчыма.

— У гэтай сітуацыі ёсць два выхады. Калі гэта не цяжка — ехаць у мясцовы райцэнтр і набываць у аддзяленнях Ашчадбанка акцыі. Звяртацца трэба толькі ў той філіял АСБ «Беларусбанка», дзе адкрыты вамі чэкавы рахунак. Па прад'яўленні пашпарта і сертыфіката ІПЧ «Маёмасць» запаўняецца заяўка-дагавор на набыццё акцый і афармляецца плацежнае даручэнне на пералічэнне патрэбнай колькасці чэкаў на спецчэкавы рахунак акцыянернага таварыства. Затым афармляецца дагавор куплі-продажу акцый, а прозвішча пакупніка ўносіцца ў рэестр акцыянераў. Атрымаўшы сертыфікат акцый ці выпіску з рэестра акцыянераў, вы становіцеся паўнапраўным уладальнікам пэўнай часткі ўласнасці прыватызаванага прадпрыемства.

Калі па якіх-небудзь прычынах уладальнік чэкаў не можа ці не хоча сам абменьваць ІПЧ на акцыі, ён можа выдаць даверанасць на гэта сваякам, сябрам, любому іншаму чалавеку. Але акцыі даверaная асоба будзе афармляць толькі на імя ўладальніка чэкаў. Акрамя таго, каб аблегчыць працэдуру атрымання акцый, Міндзяржмаёмасць прапанавала «Беларусбанку» прымаць заяку і афармляць дакументы на іх набыццё не толькі ў раённых цэнтрах, але і ва ўсіх аддзяленнях Ашчадбанка, на цэнтральных сядзібах калгасаў, у буйных пасёлках і вёсках.

— Гэтымі днямі было дадзена «зялёнае святло» далейшай рабоце Першага рэспубліканскага інвестыцыйнага фонду. Актыўна рэкламуюць сябе мноства іншых спецінвестфондаў. Магчыма, яны змогуць дапамагчы насельніцтву больш выгадна выкарыстаць свае чэкі?

— Што датычыць ПРІФа, то мне здаецца, што адрадзіцца нанава яму пасля такога працяглага бяздзеяння будзе вельмі цяжка. Шматлікія праверкі і скандалы вакол фонду стварылі яму не зусім прывабны імідж. Таму асаблівай надзеі на хуткі росквіт яго дзейнасці ў Міндзяржмаёмасці няма. Калі разглядаць дзейнасць інвестфондаў у цэлым, то я хачу напомніць чытачам, што фонды з'яўляюцца пасрэднікамі паміж насельніцтвам і прыватызаванымі прадпрыемствамі. І, як любы пасрэднік, ён бярэ за свае паслугі плату, якая неабходна фонду на рэкламу, афармленне дакументаў і іншую арганізацыйную работу. Да таго ж, цяпер практычна ўсе інвестфонды знаходзяцца ў неспрыяльных умовах. Толькі ў гэтым годзе ім далі магчымасць-ільготу адным удзельнічаць у чэкавых аўкцыёнах. Але ўжо ў наступным годзе аўкцыёны для ўсіх будуць агульныя. У той жа час і сёння фонды не праяўляюць належнай актыўнасці. З 17 млн. чэкаў, якія былі закумуліраваны на рахунках усіх інвестфондаў, абменена на акцыі ўсяго 3,5 млн. чэкаў. Трынаццаць з паловай мільёнаў чэкаў знаходзяцца на рахунках і не працуюць на сваіх уладальнікаў. Разлічваць на якія-небудзь дывідэнды ў гэтым выпадку проста немагчыма. У той жа час кожны грамадзянін мае права напрамую купіць акцыі ў прадпрыемства і атрымаць па іх дывідэнды. І тым больш не варта прадаваць чэкі, якія каштуюць цяпер вельмі танна. Набываючы акцыі, нельга разлічваць на імгненныя дывідэнды. Але ўжо пры выхадзе эканомікі з крызісу акцыі будуць паступова даражэць. А з цягам часу яны змогуць прыносіць людзям даволі стабільныя даходы.

Гутарыў Сяргей КУРКАЧ.

...ЗАМЯНІЦЬ СВОЙ ПАШПАРТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але ўсё ж, колькі б ты ні адцягваў непрыемны момант свайго месячнага існавання без дакумента, а ісці да пашпартысткі ўсё ж прыйдзецца. На жаль, яе рэжым работы можа вас не задаволіць: як правіла, гадзіны работы пашпартысткі супадаюць з вашым рабочым днём (ва ўсякім разе такое назіраецца ў сталіцы).

Таму застаецца толькі адзін дзень — субота. Праўда, настройцеся на тое, што гэты дзень зручны не толькі для вас, а таму пакорліва правядзіце ў чарзе сярод тых, хто жадае змяніць пашпарт або прапісацца, добрую палову выхаднога дня. А для таго, каб не давялося стаяць у чарзе двойчы, майце на ўвазе, што для змены пашпарта ў сувязі са зменай прозвішча вам спатрэбяцца 4 фотакарткі каляровага або чорна-белага адлюстравання, пасведчанне аб шлюбе, канверт з маркай для паштовых адпраўленняў па тэрыторыі рэспублікі, квітанцыя аб аплаце ў Ашчадным банку дзяржпошліны ў памеры 1000 рублёў і ваш стары пашпарт.

Тым жа, хто атрымлівае пашпарт упершыню (па дасягненні 16 гадоў), зразумела, замест пасведчання аб шлюбе трэба прадставіць пасведчанне аб нараджэнні. Вам найперш прапануюць запоўніць бланк заявы. Толькі не спадзявайцеся, што ўсё так проста: для таго, каб ён быў «прыняты да ведама», вам прыйдзецца ўспомніць навыкі, атрыманыя на ўроках чарчэння ў школе і ўпісаць усе звесткі аб сабе выразнымі друкаванымі літарамі.

Аднак, якім бы доўгім ні паказаўся вам гэты ланцужок, гэта ўсё ж нішто ў параўнанні з тымі пакутамі, якія чакаюць патэнцыяльных уладальнікаў загранпашпартоў. Тут і сабраных паперак будзе больш, і чэргі даўжэйшыя, і чаканне больш стамляльнае. А таму навіна аб хуткай выдачы агульнаграмадзянскіх пашпартоў новага ўзору, з якімі можна будзе выязджаць за мяжу, усяліла аптымізм у многія сэрцы.

Але, бадай, заўчасна... Па-першае, ні ў адным пашпартным стале Мінска не змаглі назваць дакладны час з'яўлення ў іх бланкаў новых пашпартоў. Кажуць, што чакалі іх яшчэ ў пачатку кастрычніка, але ўжо канец месяца, а пра іх нічога не чуваць. Па-другое, у першую чаргу пашпарты новага ўзору будуць выдавацца асобам, якія дасягнулі 16 гадоў, а таксама грамадзянам, якім трэба памяняць пашпарты ў сувязі са зменай прозвішча. А па-трэцяе, для таго, каб з новым пашпартам выязджаць за мяжу, спатрэбіцца заплаціць за яго як за замежны пашпарт 100.000 рублёў плюс такую ж суму за кожны год яго дзеяння. Так што працэдура афармлення выезду за межы Беларусі для яе грамадзян наўрад ці спросціцца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

З 1 студзеня 1997 года выдавецтва «Мастацкая літаратура» пачынае выпуск у свет Збораў твораў народных пісьменнікаў Беларусі, чыя творчасць стала гонарам роднай літаратуры і ўключана ў школьныя праграмы. У кнігарнях «Белкнігі», «Белдруку» і «Белспажыўсаюза», якія займаюцца распаўсюджваннем твораў беларускай літаратуры, вы можаце падпісацца на:

9-томны Збор твораў Янкі Купалы;

2-томны (руская мова) Збор твораў Максіма Танка;

1-томны (руская мова) Збор твораў Максіма Гарэцкага;

6-томны Збор твораў Кандрата Крапівы,

а таксама на першыя тамы Збораў твораў Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, Івана Чыгрынава.

Знаёмства з набыткамі айчыннай літаратуры, з творчасцю яе майстроў, якія складаюць гонар Бацькаўшчыны, дасць усім аматарам роднага слова шчаслівую магчымасць дакрануцца да духоўнай скарбніцы народа.

ЧАКАЕМ ВАШЫХ ЗАКАЗАЎ!

Выдавецтва «Мастацкая літаратура»: тэл. 223-58-09; факс 226-91-12.

КРЫМІНАЛ

РЫБАЛКА «НА МІНУ»

Магутны выбух прагучаў у двары дома ў вёсцы Білева Віцебскага раёна. Узарвалася міна, якую 20-гадовы гаспадар сядзібы спрабаваў выкарыстаць для глушэння рыбы. Гора-рыбака завезлі ў бальніцу. А яго 18-гадоваму напарніку не пашанцавала — ён памёр на месцы. На кватэры ў загінуўшага — навучэнца аднаго з віцебскіх ПТВ былі знойдзены яшчэ тры мінамётныя міны, 350 грамаў толу і 223 малакаліберныя патроны. Застаецца толькі гадаць, колькі боепрыпасаў хлопцы ўжо зрасходавалі на паляванне за карасямі.

У той жа дзень жыхары вёскі Ятвезь Ваўкавыскага раёна выкапалі «скарб» — шэсць мінамётных мін часоў Вялікай Айчыннай вайны. На шчасце, удзельнікам земляных работ не прыйшло ў галаву выкарыстаць іх для рыбалкі...

Марыя МАЛІНОЎСКАЯ, БЕЛТА.

УСПЫХНУЎШАЯ РЭЎНАСЦЬ ЛЕДЗЬ НЕ СПАЛІЛА КВАТЭРУ

Рэўнасць, як вядома, дрэнны дарадчык не тое што п'янаму, але нават цвярозаму. Дарэчы, калі галаву зацямніў алкаголь, голас цвярозага розуму не чутны зусім.

Вяртаючыся дадому на падпітку, раўнівая жонка, жыхарка г. Крычава, вырашыла адпомсціць сваёй суседцы з верхняга паверха за тое, што тая «ўкрала» ў яе мужа. Апоўначы яна паставіла пад дзверы крыўдзіцелькі слоік з фарбай і падпаліла яе. На шчасце, пажар, які пачаўся, да прыезду пажарных і міліцыі ліквідавалі самі жыльцы, што прачнуліся ад падазронага шуму і дыму. У кватэры былі пашкоджаны толькі дзверы і дзвярная каробка. Тым не менш, падпальшчыцы «свеціць» за гэта — ні многа ні мала — пазбаўленне волі да 10 гадоў за наўмыснае знішчэнне маёмасці.

Віктар КУПРЭЕЎ, Сяргей РАСОЛЬКА.

ФУТБОЛ. ЧЭМПІЯНАТ БЕЛАРУСІ

У СТАНЕ ЛІДЭРАЎ ЧАСОВАЯ ЗМЕНА ВАРТЫ

На футбольным фронце VI чэмпіянату Беларусі — змена лідэра. Часовая гэта з'ява ці не, стане ясна 2 лістапада, калі мінскія дынамаўцы, якія прапусцілі 28-ы тур з-за ўдзелу ў матчы ў Валгаградзе з мясцовым «Ротарам», згуляюць на выездзе супраць «Лакаматыва-96». Дарэчы, у гэты ж дзень адбудзецца прапушчаны паядынак 19-га тура ў Гродне паміж «Нёманам» і «Дынама-93».

А на першы радок у турнірнай табліцы выйшлі футбалісты МВКЦ, якія напярэдадні ўпэўнена абыгралі магілёўскі «Днепр» з лікам 2:0. Пасля двух паражэнняў запар рэабілітавала сябе «Белшына». Бабруйчане перамаглі дома з лікам 3:1 гродзенскі «Нёман» і фактычна знялі ўсе пытанні наконт бронзавага прызёра. За два туры да фінішу ўжо вызначылася каманда, якая пакіне першую лігу. Няўдачнікам стаў рэчыцкі «Ведрыч». Апошнюю сустрэчу ён прайграў дома мінскаму «Тарпеда» з хакейным лікам 0:6.

ВЫНІКІ АСТАТНІХ СУСТРЭЧ:

Шахцёр — Дынама (Бр)	—	2:1
Абутнік — Тарпеда (Мг)	—	1:0
Дынама-93 — Маладзечна	—	1:1
Нафтан-Дэвон — Атака-Аўра	—	3:1

ТУРНІРНАЯ ТАБЛІЦА ПАСЛЯ 28-га ТУРА

		Г	В	Н	П	М	А
1.	МВКЦ	28	23	3	2	61-15	72
2.	Дынама (Мн)	27	22	4	1	79-17	70
3.	Белшына	28	18	3	7	64-31	57
4.	Дынама-93	27	15	5	7	38-27	50
5.	Лакаматыў-96	27	13	9	5	46-23	48
6.	Атака-Аўра	28	13	5	10	29-37	44
7.	Нафтан-Дэвон	28	12	4	12	40-50	40
8.	Маладзечна	28	11	7	10	41-31	40
9.	Днепр	28	10	5	13	30-34	35
10.	Дынама (Бр)	28	6	11	11	36-40	29
11.	Шахцёр	28	8	4	16	26-46	28
12.	Тарпеда (Мн)	28	6	7	15	28-50	25
13.	Абутнік	28	6	6	16	24-39	24
14.	Тарпеда (Мг)	28	6	5	17	25-60	23
15.	Нёман	27	5	7	15	22-48	22
16.	Ведрыч	28	4	3	21	14-55	15

Перадапошні, 29-ы тур пройдзе 5-6 лістапада. Матчы з удзелам лідэраў: «Лакаматыў-96» — «Белшына», «Днепр» — «Дынама» (Мн), «Маладзечна» — МВКЦ.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ДУХОЎНАЕ ПРЫЦЯГНЕННЕ

САЛАЎКІ

«На Белым моры, дзе ночы паўгода белыя, Вялікі Салавецкі востраў падымае з вады белыя цэрквы ў абводзе валунных крамлёўскіх сцен, іржава-чырвоных ад прыжыўшыхся лішайнікаў, — і шэра-белыя салавецкія чайкі пастаянна носяцца над Крамлём і клякочуць.

«У гэтай светласці быццам бы няма граху... Гэта прырода быццам бы яшчэ недаразвілася да граху», — так адчуў Салавецкія астравы Прышвін.

Без нас падняліся гэтыя астравы з мора, без нас наліліся двумастамі рыбнымі азёрамі, без нас засяліліся глушцамі, зайцамі, аленямі, а лісіц, ваўкоў і іншага драпежнага звера не было тут ніколі».

Аляксандр САЛЖАНІЦЫН, «Архіпелаг ГУЛАГ».

САПРАЎДЫ, Салаўкі быццам бы «вырастаюць» з Белага мора. Але гэта зусім не цудадзейны, а рукатворны помнік. Місіянерскі подзвіг. Выключнае сілавое поле духоўнасці.

Тут, на буйнейшым архіпелагу Белага мора, што знаходзіцца ўсяго за 160 км ад Палярнага круга, вельмі цесна перапляліся лёс народа, гісторыя царквы і палітычныя дзікунствы «пабудовы раю на зямлі». Выключнасць Салаўкоў — у самой гісторыі манастыра, заснаванага ў 1429 годзе (праз паўсотні гадоў пасля Кулікоўскай бітвы і за паўтысячы год да ГПУ, як пісаў А. Салжаніцын), і ў яго архітэктурнай адметнасці, у яго асаблівай ролі ў жыцці краіны, але і ў тым, што ў 1920 годзе манастыр быў ператвораны ў лагер, які пагалоўна знішчаў [illegible] белых афіцэраў і духавен-



ства, а потым паслядоўна ўсіх, хто трапляў пад непераборлівыя колы палітычнага тэрору. А Салаўкі [illegible] канцлагеры ў былых манастырах: моцныя замкнёныя сцены, дабротныя пабудовы і — пустэча (манахаў [illegible], іх усё роўна выкінуць).

На Салаўках ніколі не было драпежнага звера, дык людзі ператвараліся ў драпежнікаў: тут была адна з самых страшных [illegible] ГУЛАГа. Зведалі яе вядомы філосаф і святар Павел Фларэнскі, акадэмік Дзмітрый Ліхачоў, пісьменнік Алег Волкаў...

Прынамсі, на Салаўкі і раней ссылалі [illegible] — царкоўных і палітычных. [illegible] Аўраамій Паліцын, лёс якога цесна звязаны з [illegible] Раманавых на царства, дзядзька А. С. Пушкіна П. Ганібал (за сімпатыю да дзекабрыстаў), апошні кашавы Запарожскага войска Калнышэўскі (памёр, дарэчы, на 113-м годзе жыцця)...У XX стагоддзі [illegible].

Манахі Савацій і Зосіма, з якіх пачаўся Салавецкі манастыр, [illegible]. Па [illegible] стагоддзяў былі пабудаваны саборы, царквы, капліцы. Дзесяткі азёр злучыліся каналамі. Па драўляных трубах пайшла вада ў манастыр. Добрыя былі тут агароды і кветкавыя аранжарэі. Манахі вырошчвалі дыні, абрыкосы, персікі, вінаград. [illegible] ру-жы (па трубах пускалі цёплую ваду, такім чынам падагравалася зямля).

Развіваліся рыбныя промыслы, з'явіліся кузні, млыны, [illegible] ган[illegible] і цаг[illegible] прай[illegible] карні і [illegible] ство[illegible] збу[illegible] марскі [illegible] развя[illegible] камен[illegible] дзеле[illegible]вы...

[illegible] куль[illegible] цу[illegible] пісцы, [illegible] багацей[illegible], адна [illegible] бібліятэк, дзе [illegible] колькасць [illegible].

[illegible] манастыр быў [illegible] многія пабудовы, [illegible] каштоўнас[illegible] — зга[illegible] манастырская [illegible] дак[illegible] было [illegible] менна [illegible] вілася, [illegible] умела, [illegible] выкі[illegible] свед[illegible] 80-га[illegible] манахі на каленях упрошвалі камісараў пакінуць іх памерці на «святой зямлі», але з пралетарскай непахіснасцю выкінулі ўсіх, акрамя самых неабходных... «Зямля, апрацаваная на краі света, спустошвалася. Зменлівы колер неспакойнага мора. Ціхія азёры. Даверлівыя жывёлы. Бязлітасныя людзі» (А. Салжаніцын).

О, часы! О, норавы! Сцены іканапіснай майстэрні сталі турмой, а яе склад — караульнай...

«О, майстры па спусташэнню квітнеючай зямлі! Каб так хутка — за год, за два — прывесці ўзорную манастырскую гаспадарку да поўнага і незваротнага заняпаду! Як жа гэта ўдалося? Рабавалі і вывозілі? Ці даканалі ўсё на месцы? І маючы тысячы незанятых рук — нічога не ўмець здабыць з зямлі» (А. Салжаніцын).

***

У 30-я гады было модным вазіць на Салаўкі, на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага воднага шляху дзеячаў «культурнага фронту». Каб апявалі веліч працоўнага перавыхавання «класавага ворага». Таленавіты беларускі пісьменнік і журналіст Платон Галавач, чыё жыццё трагічна абарвалася 29 кастрычніка 1937 года, таксама быў у саставе адной з дэлегацый. Вынікам такога «арганізаванага падарожжа» стаў вялікі нарыс «Ад Мядзвежай гары да Белага мора». Пісьменнік паказвае, як праходзяць перавыхаванне працай «былыя сацыяльна шкодныя людзі». Пра аднаго з інжынераў зазначаецца: «Папаў у палон контррэвалюцыі і быў асуджаны за шкодніцтва па арт. 58-7».

Зараз, з вышыні часу, калі сталі адкрытымі многія сакрэтныя дакументы, калі вядома, што Платона Галавача не абмінула доля большай часткі творчай (і не толькі творчай) інтэлігенцыі, надзвычай крыўдна і прыкра чытаць вось гэтыя радкі пісьменніка: «Рэкордная дзённая выпрацоўка па бетону на Днепрабудзе не перавышала 2300 кубаметраў, а на Беламорбудзе былі дні, калі выпрацоўка дасягала 4300 кубаметраў (...) Гэтыя лічбы — не просты паказчык памераў зробленага, яны яшчэ і надзвычай яскравае сведчанне сапраўды гіганцкіх тэмпаў».

Тэмпы сапраўды былі гіганцкімі, хаця ўмовы жыцця і працы на тым жа Днепрабудзе і Беламорбудзе — непараўнальныя. Дык чаму, чаму не ўзнікала пытання: за кошт чаго — тэмпы?.. Чаму такім шчырым пафасам прасякнуты радкі, прысвечаныя «працоўнаму перавыхаванню»?.. Няма адказу.

Ці, можа, адказ трэба шукаць у 1937-м?..

***

А стварэнне рук чалавечых перажывае і перамагае ўсе часы і ўсе эпохі. Кропля камень точыць — гэта праўда. Але каменная кладка, зробленая чалавекам, — вечная.

Літаральна гіпнатызуюць сцены і вежы Салавецкага крамля: выкладзеныя з буйнога валуна, яны гарманіруюць са строгім, крыху суровым наваколлем. Прынамсі, у XVII ст. крамлёўскія сцены былі сведкамі знакамітага «салавецкага сядзення» — васьмігадовай (!) абароны манастыра ад атрада царскіх войскаў. А ў 1855 годзе, у час Крымскай вайны, да Салаўкоў падышоў англійскі карабель і на працягу шасці гадзін абстрэльваў манастыр. Ды дарэмна: снарады адскоквалі ад магутных сцен, як гарох, толькі невялікія ўвагнутасці засталіся, нагадваюць аб тым, што было...

Будавалі сумленна — на вякі.

А потым... Калі прагналі манахаў, будаваць пачалі надзвычай «кемліва»: з манастырскіх магілак забіралі надмагільныя камяні і клалі іх у фундамент узводзімых пабудоў. Якое кашчунства. Якое сімвалічнае кашчунства...

Няўжо ні ў кога не здрыганулася сэрца ад такой «рацыяналізацыі»?

***

Нягледзячы на блізкасць да Палярнага круга, на Салаўках сакавітая, шчодрая прырода. Сасновыя і яловыя бары, нізкарослы беразняк, прыгожыя лугі. На архіпелагу захаваліся і каменныя лабірынты — цікавыя помнікі эпохі неаліту. Як мяркуюць вучоныя, лабірынтам каля двух тысячагоддзяў, іх прызначэнне пакуль не высветлена. Версіі на гэты конт прапануюцца самыя розныя і нечаканыя. Адна з іх: побач з лабірынтамі часта знаходзяць пірамідкі камянёў — магчыма, гэта пахаванні. Па паданню, каб душы памершых не турбавалі жывых, побач з пахаваннямі і будаваліся лабірынты: хай мёртвыя душы блукаюць па лабірынту, выйсці з якога немагчыма. Яшчэ версія: усе знойдзеныя на зямлі лабірынты знаходзяцца пераважна на марскім узбярэжжы — магчыма, выкарыстоўваліся яны ў якасці рыбалоўнай сеткі ў час прыліваў-адліваў (праўда, ні разу з іх дапамогай не ўдалося злавіць ніводнай рыбкі). І яшчэ версія: лабірынты будаваліся як дапамога астролагам, аднак жа на Салаўках — белыя ночы... Нядаўна выказана яшчэ адна (модная) версія: падобныя лабірынты знойдзены ў Эстоніі, Англіі, Індыі, Егіпце, прычым узрост іх прыкладна аднолькавы — магчыма, касмічныя браты па розуму пакінулі на нашай планеце спецыяльныя знакі?..

***

Не ведаю, як наконт іншапланецян, але незвычайная — надзвычайная! — аура сапраўды ахутвае Салаўкі. Я была настолькі ўзрушаная і ўражаная ўбачаным, што адразу пасля паўночнай вандроўкі не змагла напісаць «дарожныя нататкі»: перашкаджалі эмоцыі. Акрамя таго, меркавала прыехаць на Белае мора яшчэ раз — летам тут прымаюць шмат добраахвотных памочнікаў — рэстаўратараў, рабочых, экскурсаводаў... Дамовілася з кіраўніцтвам Салавецкага гісторыка-архітэктурнага і прыроднага музея-запаведніка, што на наступнае лета прыеду экскурсаводам. Узяла падрабязную праграму экскурсійных маршрутаў, некалькі месяцаў сядзела ў бібліятэках, рыхтавалася. Але чарговы рэзкі паварот (пераварот?) гісторыі памяняў планы: перабудова скончылася развалам Саюза. Патэлефанавала на Салаўкі — колькасць экскурсій неймаверна зменшылася, дапамога не патрабуецца...

Пасля наведвання далёкіх астравоў у Белым моры я («атэістка-матэрыялістка») пахрысцілася. Хаця, мне здаецца, абрад хрышчэння быў прыняты ўжо там, на Салаўках.

...У капліцы манах хрысціў некалькі студэнтаў МДУ, якія ў час летніх канікулаў працавалі ў саставе будатрада на рэстаўрацыі. Манах гаварыў, здавалася б, прапісныя ісціны, але ўспрымаліся яго словы як далучэнне да святога таінства. Чалавек, які не мае сумлення, — амаральны чалавек, ён не зможа ачысціць сваю душу. Д'ябал не мае ўлады над чалавекам, калі чалавек прыходзіць да Бога. Трэба глыбей думаць аб жыцці (а што я добрага зрабіў), у душы мы павінны заўсёды мець Бога...

А вочы ў манаха сумныя, і сетка маршчын, што іх абгортвае, густая. І кожнае слова, сказанае ў каплічнай цішы, быццам замацоўваецца назаўсёды... Якія ў гэтага чалавека вочы — шэра-зялёныя, амаль празрыстыя і ў той жа час вельмі глыбокія. Усё разумеючыя — як на іконах...

Пасля завяршэння абраду хрышчэння я падышла да айца Германа. Ён не пакрыўдзіўся на мае занадта мірскія пытанні. Адказаў на кожнае — з мудрым цярпеннем, спакоем. Падумалася: так старыя людзі размаўляюць з дзецьмі. Але ж айцец Герман зусім не стары («на год старэйшы за Ісуса Хрыста»). Што ж надае яму сілы і мудрасці? «Усе — грэшнікі», — журботна гаворыць айцец Герман.

— А вы?


— О, вядома. І ў мяне грахоў цэлы мех за плячамі. Мех, у якім ёсць маленькая дзірачка, так што грахі сыплюцца пастаянна...

Там, на Салаўках, я бадай што ўпершыню пачала задумвацца над дзіўнымі метамарфозамі жыцця. Жыцця, у якім праведнікі называюць сябе грэшнікамі. А грэшнікі, наадварот, пераконваюць усіх у сваёй праведнасці.

Няўжо так будзе заўсёды?

Таццяна ПАДАЛЯК.
Фота аўтара.

ПАЭТЫЧНАЯ ГАСЦЁЎНЯ



Міхась СКОБЛА
ЗЭЛЬВЕНСКАЯ КАСА Ў МУЗЕІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Беларусы ад касы.
Л. Геніюш

Ад родных ніў,
ад роснае пакошы,
дзе пад паветкай шчыраваў варштат,
не ў наймічкі, не служкай, не за грошы
патрапіла каса ў музейны штат.

Скасіўшы дзялку, грэбавала зморай.
А тут яе, адвыклую ад рук,
крый бог, не залічылі б у меморый,
павесіўшы на заржавелы крук.

Спатрэбіцца ў Максімавай гасподзе.
Каб не зарос паэта закуток,
увечары
на чэрвеньскай выгодзе
паклёпнічацьме з бабкай малаток.

Хай бадыллё пачэзне з пераляку,
калі каса халоднаю шчакой
прытуліцца да жвірыстага гаку
у змове з маладзецкаю рукой.

Сялянка, а шляхетныя манеры.
І мроіцца — на ганку сеў Максім
і сам сябе збірае ў касінеры,
чый покліч:
Беларусь перад усім!

Касі, каса.
І крэўніцы Ларысы
радок
прывеціць рады хлопца тут,
але схапілі ў чужыне, як спрут,
за сэрца
каранямі
кіпарысы...

КАСКА АПАЛІНЭРА

Месье Кастравіцкі, вас любіць Парыж.
Хвалу уздае вам бяседа.
А ў небе лятак — нібы Юраўскі крыж
на фрэнчы вайсковым
у дзеда.

Накідвае лёс трапяткое ласо.
Вайна. Прышпітальная світа.
І сябра, як шэйха, пісаў Пікасо —
чало, бы чалмою, спавіта.

Да ложкаў казённых і мулкіх прывык —
трымалі надзейна, як прывязь.
А там, у шпіталі прысніў пухавік,
што дзед з Навагрудчыны вывез.

Над ім сам гасподзь парасон распасцёр —
махрыстага неба валокі.
З абліччам смуткім міласэрных сясцёр
над ім навісалі аблокі.

Прытуліцца плюшч,
далікатны, як плюш,
да цьмянай музейнае шыбы.
Як цісную яму франтавы капялюш!
Над Сенаю лепшы пашыў бы.

Ён ехаў дамоў
і прабіты шалом
хаваў на гняздзечка галубцы.
А цені таполяў пад колы шыхтом
кідаліся, як самагубцы.

ВЕЖА

Пасярод Еўропы горад Ніш,
ты з бядой славянскі люд радніш.

Белай Вежы
шматвяковы мур,
у жалобе бойніцы прыжмур,

Эйфеля
ажурны ў неба мост,
пачакай да зор сягаць наўпрост,

Вежа ў Пізе,
пахілі чало,
як бы там хістаць ні пачало,

сцішся, Вавілонскі даўгабуд,
хоць і ты паўстаў з людскіх пакут...

Над зямлёй хеопсаў і рабоў
вышай вежаў, атамных грыбоў,
вышай храмаў, саляных слупоў —
Вежа з чалавечых чарапоў.

Найвідушча
навакол глядзіш
са сляпых вачніцаў,
горад Ніш.

Турак з ятагана кроў саскроб.
Вежа са шляхоў людскіх не збочыць,
нібы з таго свету перыскоп —
Царства мёртвых
за жывымі сочыць.

КАПЕЖ У КАРАЛЕЎЦЫ

Надзьмуўся купал, як голуб шызы.
Ярыла шаты на дрэвы ўсцёг.
Паўзе па сценах святой Луізы
удавам стомленым
вадасцёк.

Хлябтаў ваду ён
з паднебных высяў.
Наскрозь
за дзень сакавіцкі змок.
Марознай поўначчу
падавіўся,
капеж глытаючы,
і замоўк.

Нутро бляшанае ўледзянела,
грымі ці гыркай — не пракаўтнуць.
Царква прысела на дол здранцвела,
плячом не могучы варухнуць.

Маўчаў і парк, нібы пушча, дзікі.
Ярыла завідна ў горад бег —
а кірхі ўсцяж настаўлялі пікі,
і з хмараў сыпаўся позні снег.

ЗЭЛЬВЕНСКІ КАПЕЖ

Кот схавацца паспеў пад павець.
Дождж па вуліцы крочыць. Бязлюдна.
На веранду залазіць няўклюдна
вінаград, як зялёны мядзведзь.

Пад страхой павуціна трымціць.
Між зямлёю і небам — ратуйце —
скача кропля, нібы на батуце,
ёй хутчэй прызямліцца карціць.

Сонца цягне з падхмарнай імжы
круг вясёлкавы, пругкі, як пяльцы,
ды ўцякаюць свавольнікі-пальцы
на зямлю — заплятаць капяжы.

Паўз падворак, панылы і коўзкі,
промні — скок і давай навісу
заплятаць у тугую касу
незлічона-мангольскія коскі.

ПАЭТУ Б.

Я на каханьне і любоў
не падзяляў адной любові.
Што набалела, зноў і зноў
Я на адной выказваў мове.
М. Стральцоў

Ня зьдзівіш анічым
бывалы сьвет —
усё было — што звечара, што зранку.
На пару моваў перасеў паэт,
нібы на параконную фурманку.
Маўляў, дзьве мовы — рыхтык два кані,
памчаць хутчэй, хай толькі сьвісьне дзяга.
Не павязе, як ні гані-кляні,
імклівa гэтак
конік-дахадзяга.

Паэт двухмоўны — а адна душа?
Паэт двухдушны — а адна Айчына?
Ці — у душы ў паэта ні шыша,
ці — і Айчына рвецца, як аўчына?

Паэце, глушаць песенны твой зык
з чужога сіта сеяныя гукі.
Глядзі, каб не раздвоіўся язык,
нібы ў злоўмільнай
зьвілістай
зьмяюкі.

СЁННЯ

ІМЯНІНЫ

Пр. Прмч. Андрэя Крыцкага, Мчч. бясср. Касмы і Даміяна, Прав. Лазара Чатырохдзённага.
К. Зянобіі, Пшэмыслава.

СОНЦА

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск –	7.05	16.41	9.36
Віцебск –	6.59	16.28	9.29
Магілёў –	6.54	16.31	9.37
Гомель –	6.50	16.30	9.40
Гродна –	7.22	16.55	9.33
Брэст –	7.16	17.02	9.46

МЕСЯЦ

Поўня
26
кастрычніка

НАДВОР'Е

Сёння ўдзень па рэспубліцы захаваецца воблачнае надвор'е, часам дажджы. Тэмпература паветра ў Гродне, Брэсце, Мінску, Віцебску — 6—8, Магілёве — 7—9, Гомелі — 8—10 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак воблачна з праясненнямі, часам ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Тэмпература 31-га ўначы — мінус 2 — плюс 3, удзень — 0 — плюс 5; 1 лістапада ўначы — мінус 4 — плюс 1, удзень — 3—8 градусаў цяпла.



Выпуск № 336

Рубрыку вядзе Мікалай ЧАХОЎСКІ

Каб капуста была хрумсткая...

Цяпер самая пара для квашання капусты. Гэтаму спрыяе тэмпература, набліжаная да нуля, і адметная якасць прадукцыі. Капуста выспела, налілася сокам, літаральна разбухла [illegible]. Рэж як найдарней і кладзі ў бочку. Ёсць бульбачка, будзе капуста, а да іх яшчэ і шкварка — і зімы нам няма чаго баяцца.

А ці можна захоўваць качаны, якія праляжалі паўмесяца на балконе ці ў хляве?

Ведома можна. [illegible]

[illegible] З качана-насенніка зняць усе пашкоджаныя лісты, асабліва бліжэй да каранёў, пакінуўшы толькі два-тры зялёныя. Сам качан не [illegible]лапаць. Пакласці на паліцы ці падвесіць. У памяшканні суха, але прахладна (4—9 градусаў цяпла). Насеннікі ўвесь час аглядаць і выдаляць гнілыя лісцікі.

Не прапусціце свой «сявак»

У Мінску, бадай, самая танная цыбуля. Нават у іншых рэгіёнах — Гомелі, Лідзе, Маладзечне — базарная цана вышэйшая. У сталіцы за кілаграм горкай прадукцыі просяць 3-3,5 тысячы рублёў. І прадаюць не толькі з паўднёвых рэгіёнаў Расіі ці Украіны, але і з Кобрынскага, Вілейскага, Слуцкага раёнаў.

А ці можна такую цыбулю выкарыстаць у якасці севака? Бывалыя [illegible] цыбулю і купляюць. У прадаўца [illegible]аў больш дробных асобін. [illegible] вырасце адна ці дзве-тры вялікія [illegible] будзеце захоўваць прадукцыю [illegible]дзі.

Яшчэ адна ўмова наступная: цыбуля павінна быць добра высушана. [illegible] Так што, калі купляеце, пытайцеся, [illegible] адыходзяць рэгіёны Сярэдняй Азіі, [illegible]. У вас будзе самы танны на [illegible]. Зімою кілаграм севака будзе [illegible]ьш.

ПЕРАПІСКА З ЧЫТАЧАМІ

І. АРОНАЎ з г. Гродна

[illegible]

У кожнай асобіне вяршынку абразаюць, плады змяшчаюць у сеткачкі і падвязваюць да апоры. Усе [illegible]выя кветкі знімаюць.

Падкормкі і догляд, угнаенні і палівы — як і для агуркоў. Заўважым толькі, што найлепшае развіццё кавуноў ідзе на арганіцы.

Аліне КАЗЛОВАЙ, г. Мінск

Юшка — спрадвечная рыбацкая страва. Тут кожны чалавек — творца. Вараць двайную, трайную і нават...шасцярную юшку! Вядома, тут пераважае асабісты гонар «майстра» — вось які я рыбак!

Агульныя ўмовы, выкананне якіх гарантуе смачную страву, такія. На адзін кілаграм выпатранай рыбы, у якой выняты зябры, бяруць: дзве бульбіны, адну морквіну і даволі вялікую цыбуліну, два лаўровыя лісцікі, карані сельдэрэю пятрушкі. Перац, кроп, каляндру і соль — па смаку. Ні адзін з гэтых элементаў не павінен зводзіць на нішто пах рыбы. На кілаграм злоўленых далікатэсаў — не больш як два літры халоднай вады.

Калі рыба вялікая і малая, яе дзеляць на дзве часткі. Спачатку [illegible]лкам кладуць буйную, пасля [illegible]ркі (5—8 хвілін) запускаюць дробную. Сочаць, каб не разварылася. Безумоўна, лепш, калі каструля ці іншая эмаліраваная пасуда з сіцечкам. Выцягнуў сітачка, а разам з ім і рыбу. Калі [illegible]

Хаткі для ружаў і вінаграду

Прырода ў чаканні зімы. Дрэвы скінулі лісце — жоўта-барвовыя дываны пад нагамі. Так, скажам, яблыня ці груша засцерагаюць сябе самі. А вось як быць ружам, вінаграду, іншым «цяплолюбным» культурам? Пра іх [illegible]моўку клапоцяцца людзі.

[illegible] лісце. Пад лозы-галінкі падсцілалі салому, яловы лапнік. Зверху — рамы-апоры. Яны завальваліся тым жа матэрыялам. Атрымліваецца так, што зверху і знізу рознае смецце, а пасярэдзіне — галінкі вінаграду плаваюць у паветры. Усё збудаванне накрываецца плёнкай ці руберойдам. Вышыня яго — 50—70 см. Зімою дадаткова засыпаць снегам. Раслінам суха, яны не выпраюць. А супраць мышэй кладуцца розныя прынады, ставяцца пасткі.

Калі майстраваць сховішча? Як толькі ўдараць першыя маразы — звычайна ў лістападзе. Дарэчы, яны ўжо былі.

Ці любім мы птушак?

У нас глыбокая восень. Пажоўклі і апалі долу некалі зялёныя лісточкі. Дрэвы сталі чорна-сумнымі. Туманы і вільгаць. Здаецца, прырода сцішылася, чакаючы наступлення халадоў.

І ўсё ж жыццё ў садзе працягваецца. Паглядзіце, як спрытна пералятаюць з галінкі на галінку сінічкі і іншыя птушкі. Усё агледзяць, праверацъ. Нешта з'ядуць — і далей. Кароткі ў іх «рабочы» дзень. Ледзь толькі змрок пачне гусцець, як птушкі на крылы — і ў знаёмыя месцы на начлег.

Нялёгка сябрам саду. Таму кожнаму дачніку варта дапамагчы «брату меншаму». Час змайстраваць міні-сталоўкі, ачысціць ад смецця птушыныя домікі. Абавязкова залатаць дзіркі, асабліва ў даху. Вільгаць, якая трапіць у «святліцу», зробіць «хатку» сырой. Сінічка яе пакіне, бо ў такіх гнілых умовах жыць не можа.

Што на корм сябрам саду? Іх вельмі многа. Спадабаецца птушкам семя сланечніку. Але сырое, не смажанае. Вельмі любяць сінічкі і свежаніну без солі. Яе мацаваць на дроціках. Ніхто не залезе, акрамя вёрткай птушкі. З'ядае проса, дробныя кавалачкі высушанага белага хлеба, нават бульбу. Як кажуць, голад не цётка... Заўважана, што птушкі, якія зімуюць у нашых мясцінах, вельмі ўдзячныя чалавеку за клопаты аб іх лёсе. Яны застаюцца менавіта ў тым садзе і летам. І як «полюць» яблынавы сад! Ні адна лятаючая, поўзаючая і грызучая асобіна не схаваецца ад спрытных работніц. Усіх дастануць.

Млыны Дон-Кіхота

Алег МАСЛОЎСКІ:

«КАЛІ НЕ МЫ, ТО ХТО?»

БЫВАЛІЦА

— На Урале было. Сядзім на [illegible] гары, вывучаем мясцовую флору. На адным узроўні з намі арлы лятаюць. Ніжэй пад намі, чуем, інструктар турысцкай групы [illegible]: «Куды ты, маць твая, без страхоўкі! Адказвай потым...» Толькі тады цюкнула, што мы таксама без страхоўкі. [illegible] Спускацца было вельмі цяжка. [illegible] Але зрываўся я ўжо ў іншы раз — у Апатытах і на Каўказе.

(З расказаў А. Маслоўскага.)

АД АЎТАРА — ЗАМЕСТ УСТУПУ

Адгадайце загадку: калі чалавек месяцамі не вылазіць з лесу, [illegible] — хто гэта? Лясны? [illegible] Арнітолаг? Не, не адгадалі. Гэта Алег Маслоўскі.

Чаму я пачаў свой расказ пра маладога ўвогуле чалавека, які за свае 30 з невялікім гадоў паспеў-такі нешта зрабіць у навуцы, з «горнага» эпізода? А таму, што ва ўральскім сюжэце ёсць пэўная сімволіка. Ён, да таго ж, дае ўяўленне аб характары.

САГА ПРА БЕЛАРУСКІ МОХ

Алег батанік і спецыялізуецца — на чым бы вы думалі? На імхах. У Беларусі ўсяго два спецыялісты па імхах — Генадзь Рыкоўскі і ён. Генадзь Феадосьевіч нядаўна абараніў доктарскую. «Я лічу яго дысертацыю работай суперсусветнага ўзроўню, — падкрэсліў Маслоўскі. — Бо там прааналізавана эвалюцыя мохападобных і вышэйшых раслін па ўсіх кантынентах з часоў, якія працягваюцца на сотні мільёнаў гадоў назад». Каб падахвоціць Алега, я сказаў нешта накшталт: ну падумаеш, мох! Кладуць паміж бярвеннямі, калі хату рубяць, вось і ўся карысць...

І тады каардынатар «Чырвонай кнігі Еўропы» па імхах ад Беларусі Алег Маслоўскі выдаў цэлую прамову ў абарону гэтай зялёнай траўкі (прабачце, Алег, за такую фамільярнасць). З якой я даведаўся, і вам расказваю, што імхі і лішайнікі — унікальны аб'ект для даследавання. Яны, аказваецца, — люстэрка мінулага, бо адлюстроўваюць раслінасць, якая была ў гэтай мясцовасці тысячы(!) гадоў таму. І прадказваюць будучае свайго краю, лічацца лепшымі індыкатарамі чысціні паветра, бо надзвычай адчувальныя да антрапагенных нагрузак — уздзеяння серы, свінцу, іншых цяжкіх металаў.

— Вось чаму, калі я прыходжу ў лес, — падагульняе Алег, — я заўсёды дакладна ведаю, якім было яго мінулае і што чакае яго ў будучым. Праз пяць, дзесяць гадоў. Будзе становішча стабільным ці будзе пагаршацца. Варта рабіць падсадкі ці «лячыць» неяк інакш.

Слухаў я Маслоўскага і, ставячы сябе на месца звычайнага чалавека са звычайным жыццём, скажам так, без абразы — абываценя, думаў ягонымі думкамі: ну вось, тыповае донкіхоцтва. Такая ўжо з'ява тыя імхі, каб з-за іх рызыкаваць скруціць сабе шыю, сарваўшыся з гары ці хоць бы яліны.

Злавіўшы ў маіх вачах агеньчык скепсісу, субяседнік дастаў казырную карту.

— Яшчэ ў 70-х гадах і ў нас, у былым Саюзе, і на Захадзе, незалежна адзін ад аднаго, былі распрацаваны методыкі па вызначэнню забруджанасці паветра ў гарадах пры дапамозе мхоў і лішайнікаў. З выкарыстаннем гэтых біяіндыкатараў складзены спецыяльныя карты буйнейшых гарадоў свету — Нью-Йорка, Парыжа, Лондана, Сеула, Токіо. Упершыню такую карту Мінска склалі я і мой калега. Зараз ужо праведзена картаванне абласных цэнтраў.

Алег лічыць, што гэта методыка — таннейшая і больш надзейная. На фізічныя ж прыборы ўплываюць знешнія фактары — атмасферныя ўмовы, напрыклад.

Мінчане могуць праверыць. Ідучы з работы, зірніце, ці ёсць на дрэвах на вашых вуліцах мох. Есць у Зялёным Лузе, Малінаўцы, на Паўднёвым Захадзе. Гэта самыя чыстыя раёны горада. Найбольш забруджаныя — Заводскі. Там — так званая «лішайнікавая пустыня».

Зараз методыку спрабуюць прыстасаваць для складання экалагічных пашпартоў прадпрыемстваў.

...Такая вось жыве ў чалавеку ўпэўненасць, што раз яго справа — адна з самых патрэбных. Што гэта ён і яго суполчнікі павінны ратаваць прыроду. «Калі не мы, то хто?» Я помсліва паспрабаваў збіць яго з панталыку напамінам пра высокае (у маім разуменні).

— А вам не даводзілася займацца даследаваннямі марскіх экасістэм? Гэта была б цудоўная даніна юнацкай мары.

— Марскімі экасістэмамі я не займаўся. А што да мары... Сапраўды, некалі я і мой блізкі сябар трызнілі морам. Я нават крыху паплаваў. Але біялогія пераважыла. І справа не ў тым, што пры выбары прысутнічаў пэўны элемент выпадковасці. Мы кінулі ў шапку некалькі скручаных паперак. На іх было напісана «мора» і «біялогія». Абодва выцягнулі біялогію. Я пазней ніколі не шкадаваў аб выбары. Праўда, калі шчыра, то адзін час спрабаваў пайсці, нават перайшоў, у камерцыйную структуру. Самі ведаеце, як тут нашаму брату плацяць... Не змог звыкнуцца, адмовіцца ад сябе. Цяга была настолькі моцная, што не вытрываў, вярнуўся. Гэта пакуль што адзіны, відаць, выпадак вяртання ў беларускай навуцы.

ПРА МЯДЗВЕДЗЯЎ, САПСАНАЎ І БОЛЬШ СУР'ЁЗНЫЯ РЭЧЫ

БЫВАЛІЦА

— У мядзведзяў ёсць такая звычка. Калі мядзведзь прыходзіць на чужую тэрыторыю, дзе гаспадарыць іншы самец, ён не адразу высвятляе адносіны. А кіруецца да рытуальнага дрэва — на тэрыторыі, дзе жыве мядзведжая сям'я, іх некалькі — і, выцягнуўшыся на поўны рост, робіць кіпцюрамі адзнакі. Пры гэтым глядзіць: калі ён можа дастаць вышэй за адзнакі гаспадара, тады ідзе да бярлогі і спрабуе таго прагнаць. Калі не — часцей за ўсё ідзе прэч сам. Такі вось «табель аб рангах».

(З расказаў А. Маслоўскага.)

У Бярэзінскім запаведніку Алег хацеў паглядзець, як адбываецца ўварванне заваёўніка. І страціў пільнасць. Раптам пачуў звярыны роў і ўбачыў, што ў ягоны бок кінулася мядзведзіца. Бег ён ад яе так шпарка, як толькі мог, але ўсё ж выратавала, бадай, не гэта. Мядзведзіца, хутчэй за ўсё, пужанула чалавека, адагнала ад бярлогі і не захацела адыходзіць далёка ад дзіцянят. Тым больш, што побач блытаўся мядзведзь-агрэсар.

У той год яму «шанцавала». Праз некалькі дзён вяртаўся ўвечары ў лагер. Давялося краем абыходзіць балота. І шэсць кіламетраў з васьмі, што было да лагера, за ім ішоў воўк. След у след. Чаму не напаў — хто яго ведае. Было страшней, чым каля мядзведжай бярлогі.

Бог тройцу любіць. Яшчэ адной агрэсіі Алег падвергся на Браслаўскіх азёрах. Ёсць там такі лес — «Бельмонт». На адной з палян, калі прысеў перакусіць, наляцелі ажно тры буйныя сокалы. Пікіравалі з вышыні і, дапяўшы, стараліся дастаць крыламі ці кіпцюрамі, або і дзюбай. Аберагалі сапсаны гнёзды.

Дзеля справядлівасці скажам, што гэтыя і іншыя «страшылкі» адбываліся ў асноўным у пачатку яго навуковай дзейнасці. У прыроды — свае законы, свой нораў. Спатрэбіўся час, каб засвоіць іх. Засвоіўшы, маеш больш шанцаў не надакучаць зверу, птушцы, рыбе. Арганічна ўпісацца ў тое, што цябе акружае.

Эх, каб жа ўсё тут залежала ад такіх людзей, як Алег...

Гэта не Маслоўскага думка, гэта асабіста мне так здаецца: у беларускай прыродзе ў апошнія гады з'явілася нешта незразумела-пагрозлівае. Зыходжу з уласных зносінаў з прыродай. Мне здаецца, што я адчуваю нервовасць лесу, глухую трывогу саду, узвінчанасць птушак... Можа, гэта і фантазіі. Але Маслоўскі, прама ці ўскосна, пацвердзіў іх. Варта было задаць зусім натуральнае для яго, біёлага, пытанне пра ўплыў на ягоную «парафію» малых доз радыяцыі, як Алег схамянуўся і, ацаніўшы само пытанне, пачаў гаварыць пра тое, што яўна хвалявала.

— Я раней не вельмі задумваўся над гэтым. Лічыў, што не такая і вялікая пагроза. У суседнім пакоі праводзяцца даследаванні ўплыву «чарнобыльскага фактару» на храмасомны апарат раслін. Я аднойчы паназіраў і налічыў да сарака парушэнняў на адну клетку. То адростак, то працяжка — гэта значыць парушэнні, бачныя нават воку. Прырода атрымала наймацнейшы ўдар. З'яўляюцца новыя якасці. Ідуць мутацыі. У раслін — нейкія незразумелыя органы, развіваецца гігантызм. Мяняюцца колер, памеры, форма — тых жа лістоў, сцяблін, кветак. Усе гэтыя парушэнні замацоўваюцца ў генатыпе, і яны будуць распаўсюджвацца далей. Праблема ў тым, ці здолее прырода сама ўзнавіцца, «разбавіць» пры скрыжоўванні гэтыя мутацыі. Калі не, то яны змогуць замацавацца і ўплываць усё больш адчувальна. У прыродзе, а чалавек і ўсё жывое — яе частка, пачнецца «ланцуговая рэакцыя». Баюся, што калі мы не задумаемся, не зоймемся ўшчыльную хваробамі прыроды, то праз нейкі час некаму будзе займацца нашымі.

Вось-вось. Яшчэ адно донкіхоцтва майго героя. Дзе тое было, каб мы так хутка схамянуліся і пачалі ратаваць небараку прыроду. А заадно і сябе, таксама небарак.

ПРА ЧОРНАГА БУСЛА І ДЗІКІ ЦЮЛЬПАН

БЫВАЛІЦА

— У прыродзе біялагічны індыкатар — той жа мох. У грамадстве — дзеці. Гэтым летам у дзіцячым лагеры я вёў гурток, праводзіў экскурсіі ў заказнік. Пагаворыш з імі — нашы дзеці выдатна ведаюць пра аперацыі «Грынпіс» у Індыйскім акіяне, перажываюць за лёс афрыканскага насарога. Гэта ўсё цудоўна. Але ў нас ёсць свае праблемы. Тая ж праблема чорнага бусла. Або не менш сур'ёзная — дзікага цюльпана. Раней вучоных хвалявaў лёс белавежскага зубра. Зубр змог ацалець. Зараз трывожыць чорны бусел.

(З расказаў А. Маслоўскага.)

У нарачанскіх лясах схавалася самае прыгожае возера Беларусі — Глыбелька. Пасярэдзіне возера — маленькі астравок, і на ім некалькі стромкіх сосен. Калі глянуць зверху, вельмі падобна на сэрца, пранізанае стралой. Там расце меч-трава. І толькі там існуе ў прыродзе дзікі цюльпан. А на Брэстчыне, калі доўга шукаць, як тую папараць-кветку, можна знайсці каралеўскі папаратнік. З'ява настолькі рэдкая, што тады на месца выязджае амаль палова Інстытута біялогіі з Мінска. А на Палессі, калі пашанцуе, сустрэнеш чорнага бусла, птушку пужлівую і гордую. Гняздуецца ён у самых чыстых мясцінах. Такіх мясцін усё менш, а таму на вачах менее і чорнага бусла...

Я цвёрда памятаў пра тую абалонку абываценя, якую на сябе нацягнуў у пачатку нашай з Алегам сустрэчы, і не даў уцягнуць сябе ў размовы яўна ламанчскія, пра знікаючыя цуды айчынных лясоў. Што мне, абываценю, да знікаючай гордай птушкі — чорнага бусла? Хочажыць — хай прыстасоўваецца да бруду. А дзікі цюльпан... Прападзе ў прыродзе — камерсанты наладзяць масавую вытворчасць у цяпліцах. У жыцці заўсёды існуе замена, двайнік, дублёр. Замест цукру — ксіліт. Замест натуральнай ікры — ікра з нафты.

Алег сумна ўсміхнуўся. Расказаў, што нядаўна сустрэў на «Дынама» старога знаёмага, які раней не памятаў сябе ад захаплення археалогіяй, а зараз гандлюе на стадыёне шырспажывам. Таксама вось знайшоў замену. А на археалогію, здаецца, махнуў рукой.

Адсюль размова плаўна перайшла да тэмы пра лёс інтэлігенцыі. Як і на пачатку веку, яна зноў апынулася сёння, на рубяжы стагоддзяў, на такім жа значным, як і тады, пераломе.

Гэта балючая для мяне тэма, і я не змог далей прыкідвацца раўнадушным. Алег гаварыў пра тое, што ў высокаадукаванай краіне інтэлігенцыя павінна «ставіць планку», задаваць эталон ва ўзаемаадносінах астатніх слаёў насельнікаў. Ягонае донкіхоцтва не давала яму цвяроза агледзецца вакол сябе і ўбачыць, што інтэлігенцыя наша сёння ўсё больш нагадвае чорнага бусла, які асуджаны на выміранне. Калі некаму больш падабаецца вобраз дзікага цюльпана або каралеўскага папаратніка — калі ласка. Хай так. Стагоддзе было затрачана на тое, каб спачатку выбіць інтэлігенцыю, выразаць яе пад нож, бо была яна «чужой», буржуазнай, услед за гэтым з вялікай цяжкасцю ўзгадаваць сваю, рабоча-сялянскую, каб вось зараз дазволіць адчуць ёй галаднаватымі жыватамі блізкасць да пралетарскіх каранёў — такіх жа паўгалодных. Я некага вінавачу ў тым? Ды не. Гісторыя робіць чарговы свой віраж. Я нават не асуджаю тых з інтэлігентаў ці псеўдаінтэлігентаў, хто заняўся апалагетыкай або, як знаёмы нашага героя, гандлем на «Дынама». У кожнага свой шлях пад Сонцам.

Не хацелася б толькі, каб усе мы сталі гандлярамі на стадыёне. Хто — шырспажывам, хто — сумленнем.

А Алег зноў асядлаў любімага канька:

— Калі ў нас сфарміруецца склад мыслення, скіраваны на гармонію, на разуменне складаных узаемасувязей у маціпрыродзе, тады і ў жыцці многае стане прасцей і разам з тым — лепш.

Давялося вяртаць яго на грэшную зямлю.

— Вы служылі ў Афганістане. Вы не прачынаецеся начамі ад страху?

І Маслоўскі мусіў вярнуцца памяццю ў першыя месяцы ўводу войскаў у Афганістан. Ён служыў там у артылерыі, і баявых эпізодаў хапіла, каб зразумець цану міру, але «афганскага сіндрому», на шчасце, дамоў не прывёз. Прывёз раздумлівыя песні. Стаў заядлым аматарам аўтарскай песні. Піша вершы і мелодыю да іх. Але гэта так — для сябе і сяброў, для начнога кастра. Яны скіраваны ўнутр.

Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Post Factum

Гэты дзень у гісторыі

Сёлета **спаўняецца 550 гадоў** Акадэмічнаму летапісу-спісу Беларуска-Літоўскага летапісу 1446 года, у які ўваходзяць скарочаны агульнарускі летапіс, Смаленская хроніка, «Пахвала Вітаўту», смаленскія пагадовыя запісы і «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх».

30 кастрычніка 1786 года, паводле рашэння Кангрэса Злучаных Штатаў, уведзены ў абарачэнне долар — спачатку сярэбраны, а затым і залаты.

У гэты дзень **у 1905 годзе** нарадзіўся вядомы беларускі скульптар, народны мастак Беларусі А. Бембель.

30 кастрычніка 1988 года ў Мінску адбыўся масавы мітынг-рэквіем «Дзяды» памяці ахвяр сталінізму, гвалтоўна разагнаны камуністычнымі ўладамі.

Цікава

По разліках амерыканскага геафізіка Бенджаміна Фонга, у апошнія дзесяцігоддзі чалавек накапіў столькі вады ў штучных вадасховішчах, што скорасць вярчэння Зямлі крыху павялічылася.

За апошнія 40 гадоў у вадасховішчах накапілася прыблізна 10 трыльёнаў тон вады. Гэтыя запасы размешчаны пераважна ў Паўночным паўшар'і. Вада аказалася адцягнутай з акіянаў. У выніку маса вады ў раёне экватара зменшылася, а ў Паўночным паўшар'і — павялічылася. У сувязі з тым, што 10 трыльёнаў тон вады прыблізілася да восі вярчэння планеты, яна пачала круціцца крыху хутчэй. За кошт гэтага эфекту за апошнія 40 гадоў дзень паменшыўся на восем мільённых долей секунды. Вядома, гэта вельмі мала, аднак гэта — непасрэдны эфект дзейнасці чалавека.

Акрамя таго, паколькі вадасховішчы размешчаны несіметрычна ў адносінах да восі Зямлі, гэтая вось таксама зрушылася: ад Паўночнага полюса на 60 сантыметраў на захад Канады. А вось гэта ўжо істотна.

Неверагоднае...

Як паказалі нямецкія арнітолагі, многія птушкі вельмі стойкія да ўздзеяння алкаголю.

У іх крыві, страўніку і кішэчніку выяўлена шмат ферментаў, якія разбураюць алкаголь. Таму, напрыклад, шпак, калі б ён быў памерам з чалавека, мог бы без усялякай шкоды для сябе выпіваць кожныя восем хвілін бутэльку белага сухога віна.

Такая асаблівасць з'явілася не выпадкова: многія птушкі харчуюцца ў прыродзе ягадамі, у тым ліку і пераспелымі, а ўтрыманне спірту ў іх з-за дзейнасці драджавых грыбкоў можа даходзіць да пяці працэнтаў, г. зн. як у піве.

Дзесьці на белым свеце

У гэтага маленькага кавалачка сушы ў Індыйскім акіяне ёсць і афіцыйная назва — востраў Фрафаост. Але маракі, якія плаваюць у тутэйшых водах, называюць яго паміж сабой «мяў-мяў».

Адзінымі насельнікамі вострава з'яўляюцца каты. 105 гадоў назад тут на рыфах разбіўся карабель. Уцалелыя матросы змаглі дабрацца да берага, аднак, не дачакаўшыся выратавальнікаў, загінулі адзін за адным. Затое выжылі каты, якія знаходзіліся на судне — некалькі пярэстых маленькіх драпежнікаў. З часам яны размножыліся, стаўшы абсалютнымі гаспадарамі сваёй «малой зямлі». Зараз на востраве іх больш за тысячу. Каты выдатна плаваюць і нават ныраюць. Харчуюцца тым, на што багатыя прыбярэжныя воды — дробнай рыбай, ракападобнымі, марскімі вожыкамі... Пачалі адзічэлыя каты наладжваць бясконцыя разборкі і наладжваць такія канцэрты, якія нідзе больш не пачуеш.

Загадкавае...

І ў псіхічна нармальнага чалавека ў галаве могуць гучаць «галасы».

Калі чалавек даўно не быў у стаматолага, яго заржавелыя металічныя пломбы і каронкі могуць прымаць сігналы блізка размешчаных радыёперадатчыкаў і пераўтвараць іх у гук, які затым праз чарапную косць трапляе ў вуха. На думку вучоных, толькі 40 працэнтаў людзей з «галасамі» ў галаве — псіхічнахворыя. У астатніх жа — проста дрэнныя зубы!

«Іх» мараль

Як вы думаеце, якое яшчэ баявое майстэрства можа вынайсці краіна, якая ўжо падарыла свету кун-фу? На гэты раз — барацьбу... мабільнымі тэлефонамі.

Прынамсі, з таго часу, як мабільны тэлефон у Ганконгу носіць з сабой кожны шосты грамадзянін, па звестках паліцыі, ён часцей за ўсё выкарыстоўваецца як зброя ў бытавых вулічных бойках, і кожны дзень хтосьці добра атрымлівае гэтым прыборам па галаве.

А яшчэ быў выпадак

Няцяжка сабе ўявіць рэакцыю 97-гадовага Ота Бішафа, калі нядаўна ваеннае ведамства прыслала яму па пошце медаль... за ўдзел у 1918 годзе ў бітве пры Арагоне. Заслужаная ўзнагарода спазнілася ўсяго на нейкіх 78 гадоў!

З жыцця вядомых

Тэатральны крытык Барыс Мядзведзеў расказваў.

Тэкст Гімна Савецкага Саюза аддрукавалі на прыгожай паперы, завізіравалі мноствам подпісаў і сабраліся везці Сталіну. Аднак, прыйшоўшы раніцай у кабінет, старшыня Камітэта па справах мастацтваў Храпчанка не знайшоў паперы. Уся ўстанова, ахопленая страхам, кінулася на пошукі. Марна. «Заўгас» Ратаtaеў накіраваўся на сметнік. На бяду, сметнік толькі што ачысцілі. Дагналі машыну, вывернулі смецце і сапраўды знайшлі бясцэнны лісток. Ратаtaеў выклікаў жонку, тая асцярожна разгладзіла гімн прасам і зняла з яго плямы. Гаротную паперыну ўручылі старшыні камітэта, і той з радасці назначыў Ратаtaева сваім намеснікам па кадрах.

Але шчасце не бывае доўгім. На праслухоўванне оперы Мурадэлі «Вялікая дружба» ад камітэта змог прыйсці толькі Ратаtaеў. ЦК пацікавілася ягонай думкай — Ратаtaеў выказаўся станоўча. Адкуль яму было ведаць, што яе ўжо праслухаў Сталін і застаўся нездаволеным? Ратаtaеў быў разжалаваны.

36,6°

Як вылечыць дэрматыт?

Паважаная рэдакцыя «Звязды»! 23 кастрычніка гэтага года ваша газета паведаміла, што ў канцы месяца ў Мінску будзе праходзіць міжнародная канферэнцыя па рэабілітацыі хворых і інвалідаў.

Я інвалід II групы. Ужо цэлы год пакутую ад алергічнага дэрматыту. Участковы ўрач назначыў мне розных пілюль, якія практычна не дапамагаюць. Дык што мне рабіць, як лячыцца?

З павагай
Герасім Фадзеевіч ЛЮБАСКІН,
г. Бабруйск.

Дэрматыт — гэта вострае запаленне скуры, якое ўзнікае пры ўздзеянні на яе самых розных фактараў: фізічных (уздзеянне высокай або нізкай тэмпературы, пераграванне на сонцы, рэнтгенапраменьванне), біялагічных (насякомыя, кляшчы, расліны), хімічных (шчолачы, кіслоты, касметычныя сродкі, растваральнікі).

Вось якія звычайна **прыметы гэтай хваробы:** на скуры з'яўляецца ацёк, пухіркі, яна можа пачырванець і свярбець. Праз нейкі час пухіркі, лопаючыся, выдзяляюць клейкую вадкасць, якая, падсыхаючы, утварае струпы, пастаяннае адчуванне смылення, свербу.

Метады лячэння пры гэтым самыя розныя.

Найперш трэба ўхіліць прычыну і прымаць проціалергічныя прэпараты (флуцэнар, фтаракорт, аксікорт). Прымяняюцца таксама прымочкі з лекавых траў (корань валяр'яну, рамонак, ліст трыпутніку, кара дуба). На ноч змазваюць мазямі з процізапаленчым эфектам.

Трэба адзначыць, што як вынік дэрматыту можна атрымаць экзэму, у тым ліку вострую і хранічную.

Яна ўзнікае на кісцях рук, твары, шыі. Скура ацякае, чырванее, пухіркі выдзяляюць вадкасць, утвараецца мокрая паверхня, а затым струпы.

А лячэнне экземы такое ж, як і дэрматыту. Пры сухой паверхні прыкладваюць да ранак тальк, крухмал, цынкавую мазь. Рэкамендуецца выкарыстоўваць таксама мазі, якія ўтрымліваюць серу.

Паведамляем вам заадно, паважаны Герасім Фадзеевіч, што арганізацыйны камітэт міжнароднай канферэнцыі «Медыцынская, прафесіянальная і сацыяльная рэабілітацыя хворых і інвалідаў» знаходзіцца ў Мінску: Старабарысаўскі тракт, 24. Тэлефон 264-95-16, 264-16-95.

Падрыхтавала
Вольга РАМАНЮК.

Віншаванні

Дарагую мілую маці, бабулю Тамару Міронаўну МІХАЛАП віншуем з днём нараджэння. Моцнага здароўя табе, доўгіх шчаслівых гадоў жыцця.
Дзякуй, родная, за ўсё.
Дачка, зяць, унукі Андрэй, Ірына, г. Бабруйск.

Віншуем з 40-годдзем Тамару Уладзіміраўну КРАМЯНЕЎСКУЮ. Жадаем моцнага здароўя і доўгіх гадоў жыцця.
Сябры па працы з калгаса імя Чкалава Клецкага раёна.

Віншую каханую нявесту з днём нараджэння. Хай у тваім жыцці будзе святло.
Аляксандр Русенчык, г. Жодзіна.

Дарагія Іра і Віця ДУБЛЕВІЧЫ.
Ад усёй душы віншуем вас з днём вяселля. Жадаем моцнага здароўя і доўгіх шчаслівых гадоў жыцця.
Мама, тата, в. Маркава Маладзечанскага раёна.

Віншуем дарагіх бацькоў Вольгу Аляксандраўну і Іпаліта Адамавіча КАЗЮЧЫЦАЎ з залатым вяселлем і адначасова тату — з 75-годдзем.
Зычым ім добрага святочнага настрою, моцнага здароўя, бадзёрасці і доўгіх гадоў жыцця.
Дзеці, унукі, зяць, нявесткі.

ТЭЛЕБАЧАННЕ, 30 кастрычніка

Беларускае тэлебачанне

8.00 Навіны.
8.15 «Хай б'юць мяне — дужэйшы буду». Дак. фільм БТ.
9.00 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 7-ы клас. Аповесць Васіля Быкава «Жураўліны крык».
9.35 «Тайна Снежнай каралевы». Маст. фільм. 1-я серыя.
10.45 «Тры сінія-сінія возеры малінавага колеру», «Ох, адпачыў!». Мультфільмы.
11.10 «Трапічная спёка». 5-я серыя.
12.10 Відзьма-нявідзьма.
13.10 «Спрытнюгі». Маст. фільм з субцітрамі.
14.30 «Ане Вескі». Фільм-канцэрт.
15.00 Навіны.
15.10 «Комік Маскоўскага цырка Карандаш». Тэлефільм.
16.20 «Калейдаскоп сустрэч». Аздараўленчая школа для беларускіх дзяцей у Балгарыі.
17.05 Крэда. Новыя формы эканамічных адносінаў на Беларусі.
17.25 «Творчая сустрэча». Прэзентацыя аудыёальбома паэтэсы Л. Рубальскай. Перадача з Віцебска.
17.55 Госці ў хату. «Добрыя суседзі».
18.25 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны (з сурдаперакладам).
19.00 Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Беларусь — Боснія і Герцагавіна. У перапынку (19.40) — Дзённік фестывалю «Залаты шлягер».
20.30 «Хто гэта?» Тэлегульня.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Аўта-парк.
22.15 К. Васільева і К. Лаўроў у мастацкім фільме «Прэферанс па пятніцах».
23.50 Навіны.
0.05 Каралеўскае паляванне.

ГРТ

11.00 Навіны.
11.10 У эфіры тэлерадыёкампанія «Мір». «Першыя асобы». Старшыня Дзяржаўнай Думы РФ Г. Селязнёў.
11.55 «Рускі транзіт». 4-я серыя.
12.50 «Жоўцік». «Вярніце Рэкса». Мульфільмы.
13.15 «Брэйн рынг».
14.00 Навіны.
14.20 «Касмічныя вартаўнікі лейтэнанта Марша».
14.45 Кактус і Ко.
14.55 «До-мі-соль».
15.15 Покліч джунгляў.
15.40 «Элен і хлопцы».
16.05 «Тэт-а-тэт».
16.30 «Вакол сусвету».
17.00 Навіны.
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 «Адгадай мелодыю».
19.05 «Каю памяталі...» Людміла Цэлікоўская.
19.45 «Спакойнай ночы, малышы!»
20.00 Час.
20.35 Праграма перадач.
20.40 КВЗ-асарці.
21.15 Футбол. «Мілан» (Італія) — «Гётэ» (Швецыя).
23.20 Навіны.
23.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд 7 матчаў.

Расія

6.25 Па дарозе на працу.
6.35 «Мак і Матлі». Серыял.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 У свеце капіталу.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 Дарагая рэдакцыя...
8.55 «Санта-Барбара».
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 — 11.35 «Небяспечны паварот». Маст. фільм. 1-я серыя.
16.20 Блак-нот.
16.35 «Чэленджэрс». Серыял для падлеткаў.
17.05 Тэлечасопіс «Здароўе».
17.15 Даміно Міхаіла Баярскага.
17.45 Суайчыннікі.
18.10 Клуб губернатараў.
18.40 Асабліва важныя персоны.
19.30 «Санта-Барбара».
20.30 «Гарадок». Забаўляльная праграма.
21.05 Надвор'е.
21.10 «Адтэрміноўка прыгавору». Маст. фільм.
23.35 Музыка ўсіх пакаленняў.
23.50 Хто на што здатны.
0.05 — 0.25 Не спі і глядзі. «Другое дыханне».

Санкт-Пецярбург

11.55, 13.55, 16.00, 18.55, 23.05 Інфарм ТБ.
12.10 «Партрэт жанчыны». Серыял (Бразілія). 2-я серыя.
13.00 Тэрмін адказу — сёння.
13.25 Парады садаводам.
13.40, 20.35 Тэлеслужба бяспекі.
14.10 «Дэмпсі і Мейкпіс». Серыял.
15.00 «Адысея Аляксандра Вярцінскага». Фільм 2-гі.
16.15 «Асабістая справа». У. Жырыноўскі.
16.40 «Інспектар Гаджэт». Мультсерыял.
17.05 Храм.
17.35 Паказвае Ленінградская АТК.
18.40 Вялікі фестываль.
19.15 Спорт.
19.20 «Партрэт жанчыны». Серыял (Бразілія). 2-я серыя.
20.10 «Дварцовыя тайны». Дак. міні-серыял. 1-я серыя. «Забойцы».
20.50 Спартыўны агляд.
21.05 «Дэмпсі і Мейкпіс». Серыял.
21.55 Падзея.
22.10 — 23.05 «Раман імператара». Маст. фільм. 2-я серыя.

НТБ

7.00, 9.00, 11.00, 13.00 Сёння.
7.15 Дэтэктыў Д. Х. Чэйза «Перамяніце абстаноўку». (Італія). 1-я серыя.
7.55 Лепшыя цыркі свету. «Каралеўскі цырк».
9.15 Маст. фільм «Дзяўчынка з горада».
10.30 Маст. фільм «Цудоўныя гады» (ЗША).
10.50 Доктар Вугал.
11.15 Маст. фільм «Акіяны агню». (ЗША).
12.45 Лацінаманія.
13.15 Фестываль міні-серыялаў «Тайны злачынства». (Італія).

Расійскія ўніверсітэты

14.45 Педагогіка для ўсіх.
15.20 Руская мова. Сакрэты арфаграфіі. Урок 6-ы.
15.40 Міжнародны жаночы турнір па тэнісу. Кубак Крамля.
16.40 Навіны.

НТБ

17.00 Маст. фільм «Дзеці супраць монстраў». (ЗША).
17.30 Праграма для дзяцей. «Вуліца Сезам».
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.35 Герой дня.
19.00 Біл Косбі ў фільме Сідні Пуацье «Папа-здань». (ЗША).
20.35 Рускі альбом. Група «Калібры».
21.35 Фестываль міні-серыялаў. «Тайныя злачынствы». 5-я серыя.
22.30 Часіна.
23.20 Чэмпіянат свету па рафтынгу.
23.50 Кафэ «Абломаў».

8-ы канал

18.00 Мульфільм.
18.45 Маст. фільм «Раба кахання».
20.30 «Дракула».
21.45 Навукова-папулярны экран.
22.15 Маст. фільм «Аўтар песень».

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».
Рэгістрацыйны нумар 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220013, гор. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 68-29-19; намеснікаў галоўнага рэдактара — 32-44-12, 32-14-25, 32-35-05; аддзелаў: інфармацыйна-аналітычнага — 32-38-02, 68-28-14, 68-29-68, эканомікі — 32-31-21, 68-29-68, палітыкі — 68-27-57, 68-28-64, культуры — 68-29-42, 68-28-27, сацыяльных праблем — 68-28-69, пісьмаў — 68-27-47, маралі і права — 68-28-51, міжнацыянальных адносінаў — 68-27-40, 68-28-69, журналісцкіх расследаванняў — 68-28-38, 68-28-72, беларускай дыяспары — 68-28-27, знешнеэканамічнай дзейнасці — 68-29-44; аглядальнікаў па праблемах: навукі і адукацыі — 68-28-31, экалогіі і ліквідацыі вынікаў Чарнобыля — 68-28-36; уласных карэспандэнтаў: у Гродне — 33-25-29, Гомелі — 53-13-92, Баранавічах — 7-26-02, Паставах — 22-400; бухгалтэрыі — 32-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-31-98. ФАКС: 32-04-52, 68-28-77.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.
Тыраж 94.430. Індэкс 63850.
Зак. № 6935.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 20.15.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12